СКЛАДАЛЬНІК
Г.Я. Адамовіч, загадчык кафедры беларускай літаратуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

Кафедра беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”;

Е.А. Лявонава, дацэнт кафедры зарубежнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:

Кафедрай беларускай літаратуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка” (пратакол № 7 ад 31.03.08);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка” (пратакол № 3 ад 24.04.08);

Навукова-метадычным саветам па гуманітарнай адукацыі вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай адукацыі (пратакол № 4 ад 29.08.08)

Адказны за выпуск: Г.Я. Адамовіч

# Тлумачальная запіска

“Сусветны літаратурны працэс” – дысцыпліна, якая з’яўляецца традыцыйнай і прынцыпова новай адначасова. Традыцыйнасць абумоўлена тым, што сусветны літаратурны працэс складаецца з літаратурных працэсаў асобных краін народаў свету. Таму аб’ектам вывучэння з’яўляюцца выдатныя творцы сусветнага пантэона, “залаты фонд” тых літаратур, якія вызначаюць асноўныя кірункі развіцця літаратуры ў той ці іншы гістарычны перыяд і маюць непераходзячае значэнне ў стагоддзях. Навізна выкладання гэтай дысцыпліны заключаецца ў асаблівай увазе да тых аўтараў і твораў, якія адыгралі вялікую ролю ў развіцці іншанацыянальнага літаратурнага працэсу і разам з тым дапамагаюць больш выразна акрэсліць месца беларусаў у свеце і прадстаўнікоў іншых народаў у Беларусі, убачыць беларускую літаратуру сярод літаратур замежных краін на розных этапах іх развіцця, зразумець, што новае ў прачытанні сусветна вядомых аўтараў адкрылі беларусы, якім чынам беларуская літаратура і яе творцы ўздымаюць на новы ўзровень духоўныя каштоўнасці народаў свету.

Асноўная **мэта** – раскрыць багацце, шматстайнасць, непаўторнасць сусветнай літаратуры на розных этапах яе развіцця, а таксама ў яе сувязях з літаратурным працэсам у Беларусі. **Задачы**:

– акрэсліць асноўныя этапы, заканамернасці літаратурнага працэсу ў розных рэгіёнах свету, іх канкрэтна-гістарычны і разам з тым “вечны”сэнс;

– абазначыць тыпалагічныя адметнасці вядучых літаратурна-мастацкіх кірункаў, плыняў, школ, што знайшлі сваё ўвасабленне ў прадстаўнікоў іншых народаў і пакаленняў;

– даць звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, якія адыгралі асаблівую ролю ў сусветным літаратурным працэсе, аказалі адметны ўплыў на фарміраванне нацыянальнай літаратуры Беларусі;

– ахарактарызаваць асноўныя творы замежных пісьменнікаў, якія складаюць “залаты фонд” літаратуры, выявіць іх агульначалавечы змест, актуалізаваць іх значэнне ў айчынным літаратурным працэсе;

– раскрыць сэнсавую глыбіню, шматзначнасць і непаўторнасць тых вобразаў замежных пісьменнікаў, якія набылі агульначалавечае значэнне, “новае жыццё” ў кантэксце іншанацыянальных літаратур і ў творчасці прадстаўнікоў розных пакаленняў.

– выявіць нацыянальную адметнасць і разам з тым акрэсліць агульнае ў змястоўна-фармальнай структуры твораў пісьменнікаў народаў свету.

Вывучэнне дысцыпліны “Сусветны літаратурны працэс” дазволіць сфарміраваць у студэнта ўяўленне пра непарыўнасць літаратурнага развіцця ў маштабах агульначалавечай культуры і яго дыскрэтнасць у адлюстраванні асаблівасцей пэўных эпох і народаў, зразумець, што літаратура – гэта незаменны сродак фарміравання маральна-каштоўнасных арыенціраў маладога чалавека, яго духоўна-эстэтычнага патэнцыялу, творчай запатрабаванасці.

Асноўная ўвага пры выкладанні дысцыпліны “Сусветны літаратурны працэс” надаецца лекцыям, у час якіх выкладчык павінен знаёміць студэнтаў з тымі паняццямі, характарыстыкамі і з’явамі, якія складаюць аб’ект вывучэння. Разам з тым у працэсе выкладання варта раскрываць канкрэтна-гістарычны сэнс і неўміручасць у стагоддзях творчых адкрыццяў пісьменнікаў, дапамагаць убачыць непаўторнасць індывідуалізаваных мастацкіх вобразаў і іх нацыянальную адметнасць, выяўляць багацце нацыянальнага і індывідуальнага чалавечага вопыту, увасобленага ў творчай спадчыне розных пакаленняў. На практычных занятках асаблівая ўвага можа быць аддадзена вывучэнню тых твораў замежных пісьменнікаў, з дапамогай якіх раскрываецца адметнасць літаратурнага працэсу асобнай краіны на пэўным адрэзку яе развіцця і разам з тым выяўляецца маштабнасць, універсальнасць творчага пранікнення аўтара ў глыбіні агульначалавечага, “вечнага”.

Самастойная праца студэнтаў, якая праводзіцца ў межах дысцыпліны “Сусветны літаратурны працэс”, можа быць арыентавана на дэталёвае знаёмства з літаратурай пэўнай нацыі або эпохі, з творчасцю таго ці іншага пісьменніка, на паглыбленае прачытанне асобнага твора. Гэтаксама варта звярнуць увагу на азнаямленне студэнтаў з тымі шляхамі, якімі адбываецца пераход іншанацыянальнага твора ў прастору беларускай літаратуры і мастацтва, на спецыфіку яго інтэрпрэтацыі рознымі пакаленнямі творцаў. Сумесная праца выкладчыка і студэнтаў можа змяшчаць таксама складванне бібліяграфіі па адной з тэм курса, састаўленне слоўніка спецыяльных тэрмінаў, збор ілюстрацыйнага матэрыялу для вывучэння сусветнай літаратуры ў беларускім кантэксце і беларускай – у кантэксце іншанацыянальных літаратур.

Пажадана, каб навучанне па дысцыпліне “Сусветны літаратурны працэс” суправаджалася не толькі прачытаннем студэнтамі найбольш важных твораў сусветнай літаратуры. Добра, каб студэнты вучылі на памяць тыя ці іншыя вершы (або ўрыўкі з твораў) замежных пісьменнікаў (у арыгінале, у перакладзе на беларускую мову, а пры яго адсутнасці або пры неабходнасці – і ў перакладзе на рускую або іншыя мовы). Гэта ўмацуе

знаёмства студэнтаў з асноўнымі здабыткамі сусветнай літаратуры, канкрэтызуе іх веданне замежнай літаратурна-мастацкай спадчыны, дапаможа ўзбагаціць асабісты творчы патэнцыял, сфармуляваць высокамастацкія адносіны да свету прыгожага і эстэтычна змястоўнага.

Дысцыпліна “Сусветны літаратурны працэс” разлічана ўсяго на 342 гадзіны, з іх 150 гадзін аўдыторных (120 лекцыйных і 30 гадзін практычных заняткаў). Формы кантролю: экзамен, залік.

Выпускнік павінен

***ведаць:***

– асноўныя літаратурныя эпохі, кірункі, стылі, іх тыпалагічныя асаблівасці, прадстаўнікоў;
– этапы і заканамернасці сусветнага літаратурнага працэсу, асаблівасці літаратуры еўрапейскіх краін і краін амерыканскага кантынента;
– традыцыйнае і наватарскае ў сусветным літаратурным працэсе на розных этапах яго развіцця, у творчасці прадстаўнікоў аднаго кірунку, таго ці іншага пісьменніка;
– жыццёвы і творчы лёс пісьменнікаў, якія аказалі найбольшы ўплыў на развіццё сусветнага літаратурнага працэсу;
– творы замежных пісьменнікаў, якія прапануюцца для абавязковага прачытання;
– факты і спецыфіку функцыянавання сусветнай літаратурнай класікі ў беларускай культуры;

***умець:***

– выяўляць агульнае і асаблівае ў развіцці сусветнага літаратурнага працэсу ў яго суадносінах з нацыянальным;
– вызначаць тыпалагічныя асаблівасці, характэрныя для таго ці іншага літаратурнага кірунку, метаду, стылю;
– аналізаваць твор у кантэксце сваёй эпохі, кірунку, творчасці пісьменніка;
– аналізаваць мастацкі твор з пазіцый яго фармальна-змястоўных кампанентаў;
– характарызаваць спадчыну пісьменніка, яго сюжэты і вобразы праз іх успрыманне, інтэрпрэтацыю ў творчасці прадстаўнікоў іншай эпохі і нацыі;
– вылучаць традыцыйнае і наватарскае ў творчасці асобнага пісьменніка, цэлага кірунку ці школы, у літаратурным працэсе той ці іншай эпохі.

## Прыкладны тэматычны план

| № | Раздзелы і тэмы заняткаў | Для спец. “**Бел. мова і літ. Дадат.спец-сць**” Аўдыторных гадзін | | | Для спец. “**Бел. .мова і літаратура**” Аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | У тым ліку | | Усяго | У тым ліку | |
| | | | Лекц. | Прак. | | Лекцый | Практ. |
| | **Раздзел 1. Старажытнасць. Антычная літаратура** | **12** | **10** | **2** | **11** | **9** | **2** |
| 1.1. | Уводзіны | 2 | 2 | | 1 | 1 | |
| 1.2. | Старажытныя літаратуры Азіі | 1 | 1 | | 1 | 1 | |
| 1.3. | Антычная літаратура: агульная характарыстыка | 1 | 1 | | | | |
| 1.4. | Антычная літаратура. Эпас | 2 | 2 | | 2 | 2 | |
| 1.5. | Антычная лірыка | 2 | 2 | | 4 | 2 | 2 |
| 1.6. | Антычная драма | 4 | 2 | 2 | 4 | 2 | 2 |
| 1.7. | Антычная проза | 2 | 2 | | 2 | 2 | |
| | **Раздзел 2. Сусветная літаратура Сярэднявечча і Адраджэння** | **18** | **14** | **4** | **18** | **12** | **6** |
| 2.1. | Літаратура Сярэднявечча: агульная характарыстыка | 1 | 1 | | 1 | 1 | |
| 2.2. | Народна-эпічная літаратура | 3 | 1 | 2 | 3 | 1 | 2 |
| 2.3. | Літаратура Сталага Сярэднявечча | 2 | 2 | | 2 | 2 | |
| 2.4. | Дантэ. “Боская камедыя” | 2 | 2 | | 2 | 2 | |
| 2.5. | Адраджэнне: агульная характарыстыка | 1 | 1 | | 1 | 1 | |
| 2.6. | Новыя жанры ў літаратуры | 2 | 2 | | 2 | 2 | |
| 2.7. | Тытаны Адраджэння | 5 | 3 | 2 | 5 | 3 | 2 |
| 2.8. | Нацыянальныя асаблівасці Адраджэння ў краінах Еўропы | 1 | 1 | | 1 | | 1 |
| 2.9. | Літаратура краін Усходу: Сярэднявечча і Адраджэнне | 1 | 1 | | 1 | | 1 |
| | **Раздзел 3. Сусветная літаратура XVII і XVIII стст.** | **14** | **12** | **2** | **20** | **16** | **4** |
| 3.1. | XVII стагоддзе і літаратурны працэс. Барока | 2 | 2 | | 2 | 2 | |
| 3.2. | Класіцызм | 2 | 2 | | 4 | 4 | |
| 3.3. | XVIII ст.: Асветніцтва | 1 | 1 | | 1 | 1 | |
| 3.4. | Асветніцтва ў Англіі | 1 | 1 | | 3 | 3 | |
| 3.5. | Асветніцтва ў Францыі | 2 | 2 | | 2 | 2 | |
| 3.6. | Асветніцтва ў Германіі | 6 | 4 | 2 | 8 | 4 | 4 |
| | **Раздзел 4. Сусветная літаратура 1-й пал. XIX ст. (рамантызм)** | **20** | **16** | **4** | **18** | **14** | **4** |
| 4.1. | Сусветная літаратура 1-й паловы XIX ст.: агульная характарыстыка. Рамантызм | 4 | 4 | | 2 | 2 | |
| 4.2. | Рамантызм у літаратуры Германіі | 4 | 2 | 2 | 4 | 2 | 2 |
| 4.3. | Рамантызм у літаратуры Англіі | 6 | 4 | 2 | 4 | 2 | 2 |
| 4.3. | Рамантызм у літаратуры Францыі | 2 | 2 | | 3 | 3 | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.5. | Рамантызм у літаратуры Польшчы | 1 | 1 | | 1 | 1 | |
| 4.6. | Рамантызм у літаратуры ЗША | 3 | 3 | | 2 | 2 | |
| | **Раздзел 5. Сусветная літаратура 2-й пал. XIX ст. (рэалізм)** | **22** | **18** | **4** | **22** | **18** | **4** |
| 5.1. | Сусветная літаратура 2-й паловы XIX ст.: агульная характарыстыка. Рэалізм | 4 | 4 | | 4 | 4 | |
| 5.2. | Рэалізм у літаратуры Францыі | 8 | 6 | 2 | 8 | 6 | 2 |
| 5.3. | Рэалізм у літаратуры Англіі | 4 | 4 | | 4 | 4 | |
| 5.4. | Рэалізм у літаратуры Германіі | 2 | | 2 | 2 | | 2 |
| 5.5. | Рэалізм у Польшчы і на Украіне | 2 | 2 | | 2 | 2 | |
| | **Раздзел 6. Сусветная літаратура апошняй трэці XIX – пач. XX ст.** | **12** | **8** | **4** | **12** | **8** | **4** |
| 6.1. | Літаратура рэалізму | 4 | 2 | 2 | 4 | 2 | 2 |
| 6.2. | Літаратура натуралізму | 2 | 2 | | 2 | 2 | |
| 6.3. | Дэкаданс | 4 | 2 | 2 | 4 | 2 | 2 |
| 6.4. | Рамантызм і неарамантызм | 2 | 2 | | 2 | 2 | |
| | **Раздзел 7. Сусветная літаратура 1-й пал. XX ст.** | **24** | **20** | **4** | **28** | **24** | **4** |
| 7.1. | Літаратура 1-й пал. XX ст.: агульная характарыстыка | 2 | 2 | | 2 | 2 | |
| 7.2. | Проза авангарду | 2 | 2 | | 4 | 4 | |
| 7.3. | Паэзія авангарду | 4 | 2 | 2 | 4 | 2 | 2 |
| 7.4. | Літаратура еўрапейскіх краін | 6 | 6 | | 6 | 6 | |
| 7.5. | Літаратура ЗША | 4 | 4 | | 6 | 6 | |
| 7.6. | Першая сусветная вайна і літаратура | 4 | 2 | 2 | 4 | 2 | 2 |
| 7.7. | Пісьменнікі свету ў барацьбе супраць фашызму | 2 | 2 | | 2 | 2 | |
| | **Раздзел 8. Сусветная літаратура 2-й пал. XX – пач. XXI стст.** | **30** | **24** | **6** | **10** | **8** | **2** |
| 8.1. | Літаратура 2-й пал. XX ст.: агульная характарыстыка | 2 | 2 | | 1 | 1 | |
| 8.2. | Літаратура пра Другую сусветную вайну | 4 | 2 | 2 | 4 | 2 | 2 |
| 8.3. | Экзістэнцыялізм | 4 | 2 | 2 | 1 | 1 | |
| 8.4. | Неаавангардызм. “Тэатр абсурду”. “Новы раман” | 2 | 2 | | 1 | 1 | |
| 8.5. | Постмадэрнізм | 4 | 2 | 2 | 1 | 1 | |
| 8.6. | Раман у літаратуры XX ст. | 2 | 2 | | 1 | 1 | |
| 8.7. | Літаратура еўрапейскіх краін | 2 | 2 | | 1 | 1 | |
| 8.8. | Літаратура славянскіх краін | 2 | 2 | | | | |
| 8.9. | Літаратура краін амерыканскага кантыненту | 3 | 3 | | 1 | 1 | |
| 8.10. | Літаратура краін Азіі | 1 | 1 | | | | |
| 8.11. | Іерархія ў літаратуры. Прэміі | 4 | 4 | | | | |
| | Усяго | **150** | **120** | **30** | **150** | **120** | **30** |

# Раздзел 1. Старажытнасць. Антычная літаратура

## Тэма 1.1. Уводзіны

**Стадыяльнасць (перыядызацыя) сусветнага літаратурнага працэсу**: традыцыйныя і найноўшыя пункты гледжання. Паняцці “сусветная літаратура”, “сусветны літаратурны працэс”, “рэгіянальная (занальная) літаратура”, “нацыянальны літаратурны працэс”.

**Міфалогія.** Міфалогія як сістэма паганскіх міфаў, ідэалогія абшчыннародавага ладу, крыніца сусветнай літаратуры. Сінтэз у міфе пазнання, веры, выдумкі. Мастацкі свет старажытнага міфа як мадэлі чалавечай цывілізацыі і маралі. Міф як з’ява культуры. Філасофскі і гістарычны сэнс. Маральны і сакральны змест, мастацкая і эстэтычная каштоўнасць міфа. Віды міфаў. Паэтыка. Логіка міфа. Яго сімволіка. Старажытныя міфалогіі свету: егіпецкая, грэчаская, рымская, індыйская, германская. Славянская міфалогія.

Вечныя вобразы антычнай міфалогіі ў беларускім кантэксце: Праметэй – у творах Я. Купалы, М. Танка, У. Караткевіча, Ц. Гартнага; Эрас – у паэме Ю. Жулаўскага “Эрас і Псіха”, цыкле “Эрас” М. Багдановіча, гісторыя пра Псіхею ў п’есе-прыпавесцы С.Кавалёва “Сёстры Псіхеі”; Ікар і Дзедал – у перакладзе (з Авідзія) М. Багдановіча, у “Паэме калодзежа” А.Разанава і інш.

## Тэма 1.2. Старажытныя літаратуры Азіі

Паняцце “антычнасць” – у шырокім сэнсе слова як “старажытнасць”, звязаная з існаваннем рабаўладальніцкіх краін Усходу і Захаду і іх культураю; у вузкім сэнсе – як культура старажытных Грэцыі і Рыма. Найстаражытныя культуры — егіпецкая, месапатамская, грэчаская.

**Акадская** літаратура, яе помнік – Эпас пра Гільгамеша. Эпас як аповяд пра мінулае, гістарычнае і міфалагічнае. Гістарычны прататып. Міфалагізацыя вобраза. Гільгамеш – культурны герой, першапродак.

Помнікі **старажытнаяўрэйскай** літаратуры – кнігі Старога Запавету (45 кніг). Тры часткі Старога Запавету. Стварэнне свету (па “Кнізе Быцця”) і чалавека. Канцэпцыя чалавека і яго вобраз. 17-я кніга – “Песня Песняў” (“Найвышэйшая песня Саламонава”). Фальклорны характар твора. Уплыў твора на лірычную паэзію розных народаў і эпох. Інтэрпрэтацыя вобразаў “Песні” ў музыцы (Э. Аміран, С. Карлбах), у выяўленчым мастацтве (графіка беларускага мастака А. Кашкурэвіча). “Эклезіяст”: двупланавасць вобразаў. Вобраз Саламона як “абагульняльная парадыгма для ўнутранага жыццёвага вопыту” (С. Аверынцаў). Скепсіс ва ўспрыманні ўпарадкаванасці Сусвету і прыроды.

Пераклады з Бібліі на беларускую мову. Біблейскія сюжэты, матывы, вобразы ў беларускай літаратуры і мастацтве.

## Тэма 1.3. Антычная літаратура: агульная характарыстыка

Першая з еўрапейскіх літаратур – антычная: літаратура Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма. Міфалогія старажытных грэкаў і рымлян. Першыя помнікі літаратуры на тэрыторыі Еўропы, спецыфіка іх запісу і захавання. Мова помнікаў. Перыядызацыя старажытнагрэчаскай і

старажытнарымскай літаратур. Узнікненне грэчаскай літаратуры на аснове міфалогіі, старажытнарымскай – на аснове народнай творчасці і старажытнагрэчаскіх традыцый. Значэнне антычнай літаратуры для станаўлення і развіцця: а) трох літаратурных родаў: эпасу, лірыкі, драмы; б) двух відаў мастацкага слова – паэзіі і прозы; в) жанраў: буколіка, гімн, гіпаталама, драма, ідылія, камедыя, ода, пасланне, сатыра, трагедыя, элегія, эпіграма, эпітафія і інш.; г) паэтыкі (антычнае вершаскладанне, тропы, стылістычныя і рытарычныя фігуры і інш.); д) асобных навук і мастацтваў у межах літаратуры: літаратуразнаўства і рыторыкі, эстэтыкі і філасофіі, гістарыяграфіі і красамоўства і інш.; е) важнейшых філасофскіх і эстэтычных паняццяў і катэгорый: гармонія, катарсіс, калакагацыя, мера, рытм, сіметрыя і г.д. Ідэал гарманічна развітай асобы: гармонія цела і духа, фізічнага і разумовага, знешняга і ўнутранага, прыгажосці і дабра. “Арэтэ” як дабрачыннасць, высакароднасць у разуменні старажытных грэкаў (розныя перыяды). Новы ідэал дабрачыннасці (“віртус”) у Старажытным Рыме.

## Тэма 1.4. Антычная літаратура. Эпас

Класічныя ўзоры эпасу перыяду разлажэння першабытна-грамадскага ладу (індыйскія эпасы “Махабхарата” і “Рамаяна” і інш.). Тыпалогія эпасу. Эпас у старажытнагрэчаскай літаратуры. Эпас Гамера. Гісторыя Троі і Траянскай вайны. Міфы траянскага цыклу і дзеянне **“Іліяды”.** Асноўная тэма – “гнеў... Ахілеса, Пелейвага сына”, тыпалагічная паралель з вобразамі Гільгамеша, Раланда і іншых эпічна маладых герояў. Увасабленне ў вобразе Ахілеса гераічнага ідэалу старажытных грэкаў. Гамераўскае пытанне. **“Адысея”:** падобнае і адрознае з “Іліядай”. Вобраз Адысея як архетып вандроўніка. Вобраз Пенелопы і сусветная традыцыя ў стварэнні жаночага вобраза.

**“Энеіда”** старажытнарымскага паэта Вергілія. Традыцыі Гамера. Услаўленне Рымскай імперыі ў асобе траянскага героя Энея. Італійская зямля як пераемніца славы траянцаў, славы адроджанай наноў Троі. Неаднастайнасць тлумачэнняў “Энеіды”. Пераасэнсаванне сюжэта ў бок зніжэння вобразаў, яго травесціраванне: беларуская паэма “Энеіда навыварат” В. Равінскага.

Пераклады класічных узораў эпасу на беларускую мову: з “Іліяды” – Б. Тарашкевіча, Ю. Дрэйзіна, з “Адысеі” – А. Клышкі і інш. Думка Я. Коласа пра стварэнне нацыянальнага беларускага эпасу на аснове народных казак і паданняў. Адлюстраванне вобразаў эпасу Гамера ў музыцы: стварэнне оперы “Тэлемах” прыпісваецца М. Агінскаму (ставілася ў 1770-я гг. на сцэне тэатра ў Слоніме).

## Тэма 1.5. Антычная лірыка

**Старажытнагрэчаская лірыка.** Паходжанне назвы, сувязь слова і музыкі. Старажытная народная паэзія як крыніца нараджэння жанраў лірыкі. Элементы жывёльнага эпасу, алегарызм, іншасказанне ў **байках**. Байкі Эзопа. Байкапісцы ў сусветнай літаратуры і на Беларусі. **Меліка** (мелічная паэзія) як адна з форм антычнай лірыкі (VII – VI стст. да н. э.). Сольная меліка. Анакрэонт – пясняр вольнадумства, бесклапотнасці і любові да жыцця – анакрэантычныя матывы ў сусветнай паэзіі (у т. л. у М. Багдановіча). Харавая лірыка (дыфірамбы, эпінікіі, парфеніі і іншыя жанры; аднаўленне вобразаў верша Алкмана “Спят вершины высокие гор и бездн провалы...” ў паэзіі Гётэ, М. Лермантава, В. Верасаева).

Дэкламацыя твора пад акампанемент флейты – формы **элегіі і ямба.** Элегія як старажытнагрэчаская вершаваная форма, яе аснова – элегічны двуверш (гекзаметр і пентаметр). Яе ўзнікненне з пахавальнай заплачкі. Разнастайнасць тэматыкі элегій. Пашырэнне малых форм у **александрыйскай паэзіі**: элегія, ямб, гімн, эпіграма, эпітафія, ідылія, буколіка. Творчасць Калімаха, Феакрыта.

**Паэзія Старажытнага Рыма**. Агульная характарыстыка. Дзве традыцыі адлюстравання тэмы кахання ў лацінскай паэзіі: суб'ектыўная (Катул, гісторыя кахання да Лесбіі: тэмы кахання-сяброўства і кахання-жадання ў яго паэзіі) і аб'ектыўная (аб каханні багоў і багінь, любоўныя элегіі ў творчасці Авідзія). Эліністычная паэзія: услаўленне Рымскай імперыі ў творчасці Вергілія, Гарацыя; паэт апазіцыйнага кірунку – Авідзій. "Оды" і іншыя творы Гарацыя. Вобразы ідэальнай утапічнай краіны Аркадыі ў "Буколіках" Вергілія. "Трыстыі" і "Пасланні з Понта" Авідзія.

Жанр элегіі ў беларускай паэзіі (Ф. Багушэвіч, М. Багдановіч, А. Куляшоў, М. Танк, П. Панчанка і інш.). Элегія як жанр музычнага мастацтва: ад жалобнай песні да лірычнай песні-роздуму з перавагаю пачуццяў жальбы і смутку. Элегіі на любоўную тэматыку, з матывамі тугі, адзіноцтва, страты: "Не искушай меня без нужды..." М. Глінкі, "Для берегов отчизны дальной" А.П. Барадзіна. З лепшых узораў жанру – "Элегія" Ж. Маснэ. Вобразы "трыяды" рымскіх паэтаў у беларускай літаратуры (народная легенда пра жыццё Авідзія-выгнанніка на Палессі – у вершах У. Сыракомлі, М. Танка і інш.). Антычная паэзія ў Беларусі: уплывы, наследаванні, перайманні, пераклад і інш.

## Тэма 1.6. Антычная драма

Драма як адзін з трох родаў мастацкай літаратуры. Аснова – дзеянне. Фарміраванне драмы ў старажытных абрадавых дзействах. Класічны перыяд у развіцці старажытнагрэчаскай літаратуры. Рымскі тэатр. Тры віды антычнай драмы: **трагедыя** (Эсхіл, Сафокл, Эўрыпід, Сенека), **камедыя** (Арыстафан, Менандр, Плаўт, Тэрэнцый), сатыраўская драма. Распрацоўка сюжэтных ліній старажытных міфаў. Адлюстраванне гістарычных падзей. Трагедыі і камедыі старажытных аўтараў як узоры сусветнай класікі.

## Тэма 1.7. Антычная проза

Станаўленне прозы як літаратурнай формы новага светаўспрымання. Лагографы – першыя аўтары старажытнагрэчаскай прозы. **Гістарычная проза** ў літаратуры Старажытнай Грэцыі: "Гісторыя" Герадота; "Гіпакратаў корпус" Гіпакрата; "Гісторыя Пелапанескай вайны" Фукідзіда. Старажытнарымскія летапісы – аналы; творы Салюсцыя, Ціта Лівія, Тацыта; "Паралельныя жыццяпісы" Плутарха.

Першыя ўзоры празаічных жанраў, што дайшлі да нашага часу, – творы **філосафаў** (Фалес, Анаксімен, Геракліт, Ксенафан і інш.). Проза сафістаў – настаўнікаў філасофіі і красамоўства. Палітычнае **красамоўства** Дэмасфена. Філасофская проза IV ст. да н.э. – дыялогі Платона, перайманне традыцый дыялогу рымскімі аўтарамі (Цыцэрон). "Паэтыка" Арыстоцеля. Вучэнне Арыстоцеля па тэорыі літаратуры.

**Раман** у антычнай літаратуры: рымскай (“Сатыры”, або “Сатырыкон”, Петронія; Апулей як стваральнік фантастычнага рамана на лацінскай мове – “Метамарфозы, або Залаты асёл”). Грэчаскі раман: гісторыя пра Дафніса і Хлою, пра цнатлівае каханне на ўлонні прыроды. Псіхалагізм “Дафніса і Хлоі” Лонга. Пастаральныя матывы. Адухаўленне прыроды, прысутнасць у ёй багоў і багінь.

Роля антычнай прозы ў станаўленні нацыянальнай літаратуры, арыгінальнай творчасці, у разуменні сутнасці чалавека, пашырэнні свецкага пачатку ў літаратуры. Шырокае знаёмства з антычнымі празаікамі ў Беларусі: захоўванне іх твораў у бібліятэках, зварот да іх нацыянальных аўтараў (на лацінскай, польскай, беларускай, рускай мовах), перайманні ўзораў,аднаўленне сюжэтаў і вобразаў у новым гісторыка-культурным кантэксце.

# Раздзел 2. Сусветная літаратура Сярэднявечча і Адраджэння

## Тэма 2.1. Літаратура Сярэднявечча: агульная характарыстыка

**Літаратура Сярэднявечча**: перыядызацыя. Новыя этнічныя супольнасці як аснова зараджэння феадальнай культуры. Утварэнне (ранне)феадальных дзяржаў і фарміраванне структуры феадальнага грамадства – передумовы развіцця літаратуры ў еўрапейскіх краінах. Саслоўны характар грамадства і наяўнасць у ёй дзвюх культур: афіцыйнай, рэлігійнай і народнай, “смехавай” (М. Бахцін). Культурныя зоны (рэгіёны) Сярэднявечча. Спецыфіка мастацкага метаду і склад сярэднявечнай літаратуры. Алегарызм і сімвалізм сярэднявечнага мыслення. Кананічнасць (традыцыйнасць) структурна-ўтваральных элементаў – топасаў (сюжэты, тыпы герояў, выяўленчыя сродкі). Жанравая рэгламентацыя і каштоўнасная іерархія жанраў. Вытокі літаратуры: антычная літаратура, хрысціянства, народная творчасць.

**Хрысціянская літаратура:** агульная характарыстыка. Прадстаўнікі. Дзейнасць Амбросія Медыяланскага, Іераніма, Аўгусціна Блажэннага. Творы ўсходнехрысціянскай патрыстыкі. Іаан Златавуст як ідэал прапаведніка. Сістэматызацыя грэчаскай патрыстыкі Іаанам Дамаскінам. Жанры агіяграфіі, гімнаграфіі, гістарыяграфіі.

Хрысціянская літаратура візантыйскага рэгіёна на беларускіх землях. Кірыла Тураўскі – “рускі Златавуст”. Выданне асноўных твораў Іаана Златавуста (“Слова пра цярплівасць і богаўхваленне”, XVI ст., “Маргарыт” у пер. Л.Зізанія, Л.Карповіча). Самыя старыя спісы “Златаструя” і “Златавуста”. “Споведзь веры” Іаана Дамаскіна ў якасці катэхізісу да XVII ст. Распаўсюджванне агіяграфіі на беларускіх землях (зборнікі “Чэцці Мінеі”, пацерыкі). Творы Яфрэма Сірына. Жанр манаскай хронікі і яе ўплыў на фарміраванне воінскай аповесці, на развіццё хронікі.

**Лацінская літаратура.** Лацінская мова – адна з асноў новай феадальнай культуры, яе пранікненне на тэрыторыю Беларусі. Клерыкальныя жанры ўласна дыдактычнага кірунку: зярцала і пропаведзь “Рымскія дзеянні”. Свецкія жанры: гістарыяграфія – летапіс і хроніка. Эпічная паэзія (жывёльны эпас XII ст. “Ізенгрым”), лірычная паэзія – элегіі, пасланні. Паэзія вагантаў: тэма абжорства, віна і застолля (“Всепьянейшая літургія”), любоўная тэматыка. Вершы на сатырычную тэму. Буранскі рукапіс, або “Карміна Бурана” (XIII ст., звыш 200 вершаў): любоўныя і застольныя песні (свецкая) і рэлігійная паэзія.

Зборнік "Вялікае зярцала", Галандыя, пер. на бел. мову з польскай, XVII ст. "Рымскія дзеянні" складзены ў XIII ст. у Англіі, праз польскае пасрэдніцтва трапляюць на Беларусь у XVIII ст. Аднайменная кантата Карла Орфа (1937 г.). Вакальна-харэаграфічная кампазіцыя "Карміна Бурана" на сцэне Нацыянальнага тэатра балета (з 1998 г.)

## Тэма 2.2. Народна-эпічная літаратура

Эпас І перыяду (разлажэння першабытнаграмадскага ладу). Помнікі. Тыпалогія. **Кельцкі эпас: ірландскія сагі.** Дзве групы саг. Легендарны герой гераічных саг гуладскага цыклу Кухулін. Легендарная біяграфія Кухуліна – ад гістарычнага да міфалагічнага. Гераічны эпас ІІ перыяду (эпохі феадалізму). Помнікі. Тыпалогія. Трансфармацыя сюжэта пра **Сігурда – Зігфрыда**. Сігурд – герой "Старэйшай Эды" (помніка скандынаўскай эпічнай паэзіі). Легендарная біяграфія Сігурда. Зігфрыд – герой "Песні пра нібелунгаў" (помніка нямецкага гераічнага эпасу): легендарная біяграфія героя. Увасабленне ў творах сацыяльна-гістарычных прыкмет часу. Французскі эпас – **"Песня пра Раланда"**: параўнальная характарыстыка са "Словам пра паход Ігаравы".

Вобразы "Песні" і "Слова" ў творах мастацтва – вобраз Карла Вялікага ў ілюстрацыях Г. Дарэ, бронзавая статуэтка імператара IX ст., опера О. Мермэ "Раланд у Рансевальскай цясніне", опера "Князь Ігар" А.П. Барадзіна (скончана Н.А. Рымскім-Корсакавым і А.К. Глазуновым). Вобразы гераічнага эпасу ў музыцы (тэтралогія Р. Вагнера "Пярсцёнак нібелунгаў").

**Эпас паўднёвых славян**: цыкл пра Косава поле (песні "Цар Лазар і царыца Міліца", "Смерць маці Югавічаў") і цыкл пра Марка Каралевіча (легендарная біяграфія героя). Вобразы Ефрасімы і Вукашына. Тыпалагічныя сыходжанні, нацыянальна-гістарычныя адрозненні з творамі іншых народаў.

## Тэма 2.3. Літаратура Сталага Сярэднявечча

**Рыцарская (куртуазная) літаратура:** гісторыка-культурны кантэкст. Паняцці "рыцарская дабрачыннасць", "куртуазія". Тыпалогія рыцарскай літаратуры. **Паэзія** трубадураў (Праванс), трувераў (поўнач Францыі), мінезінгераў (Германія). **Рыцарскі раман**. Цыклы французскага рыцарскага рамана: антычны; артураўскі, або брэтонскі (пра караля Артура); усходневізантыйскі. Легенда пра Трыстана і Ізольду: асноўныя версіі. Элементы сюжэта па розных крыніцах, аднаўленне біяграфіі Трыстана, гісторыя яго кахання з Ізольдаю, жонкаю караля Марка.

Перастварэнне матыву "кахання здалёк" французскім драматургам XIX ст. Э.Растанам ("Прынцэса Мара"). "Александрыя", арыгінал з Егіпта на грэчаскай мове, на Беларусі ў XV ст.; "Троя" – помнік беларускай перакладной літаратуры XV ст. Беларуская "Аповесць пра Трышчана" – помнік беларускай перакладной літаратуры XVI ст. Рэцэнзія М. Багдановіча на апрацоўку гэтай легенды, выкананую Ж. Бедзье. Опера Р. Вагнера "Трыстан і Ізольда", яе пастаноўка на сцэне Нацыянальнага тэатра оперы і балета (балет 1963 г.). Раман пра Трыстана на сцэне Нацыянальнага тэатра імя Я.Купалы (Малая сцэна, версія С.Кавалёва). Беларускія пераклады помнікаў рыцарскай літаратуры.

**Гарадская літаратура.** Сярэднявечны горад – складаны сацыяльны арганізм. Сатыра і дыдактыка як асноўныя кірункі. Жанры: фабліо (у Францыі), шванк (у Германіі). Зборнік шванкаў Штрыкера "Поп Аміс". Жывёльны эпас у французскай літаратуры ("Раман пра Рэнара") і алегарычная паэма ("Раман па

Ружу”). Тыпалагічнае падабенства з казкамі іншых народаў. Ф. Віён – першы французскі нацыянальны паэт.

Жанры драматургіі.

Фабліо “Завяшчанне казла” і беларуская сацыяльна-бытавая казка “Пахаванне казла”: падабенства праблемна-тэматычных планаў, матываў, вобразаў. Містэрыяльная драма “Цар Ірад” у Беларусі. Народная сцэна “Ірадзіяда, стары Рыгор і Шчогаль”, дэманічная сутнасць вобраза; “Цар Ірад” на сцэне Мінскага тэатра лялек.

## Тэма 2.4. Дантэ. “Боская камедыя”

**Асноўныя этапы** жыццёвага і творчага шляху. Дантэ – “апошні паэт Сярэднявечча і разам з тым першы паэт Новага часу” (Ф.Энгельс): па кнізе “Новае жыццё” (сімволіка колераў, лічбаў, алегарызм вобразаў) і новае, гуманістычнае светасузіранне (абагаўленне чалавека, гармонія цялеснага і духоўнага ў ім). **“Боская камедыя”:** жанр, кампазіцыя, структура мастацкага вобраза. Пакуты і цені дантава Пекла. Вобразы Чысцілішча. Дантэ і Вергілій. Дантэ і Беатрычэ. Зямны Рай і Нябесны Рай. Гуманістычныя ідэалы паэта.

Вобразы Дантэ ў ілюстрацыях С. Бацічэлі, Л. Сіньярэлі, Г. Джыральдзі, у творах Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Рафаэля. Дантэ і беларуская культура: вобразы пекла і рая ў беларускіх казках, у творах пісьменнікаў; пераклады і перайманні з Дантэ, прысвячэнні.

## Тэма 2.5. Літаратура Адраджэння: агульная характарыстыка

**Асноўныя паняцці** Адраджэння, паходжанне назвы. Перыядызацыя. Паўночнае Адраджэнне. Канцэпцыя чалавека і свету. Абагаўленне чалавека. Гармонія чалавека і свету. Рэабілітацыя зямнога, цялеснага. Паняцці “свабода”, “рэнасансны індывідуалізм”, “рэнесансны рэалізм”. Утапічная літаратура. Тытаны Адраджэння.

## Тэма 2.6. Новыя жанры ў літаратуры

**Санет**: адкрыццё чалавека і свету. Санет як цвёрдая страфічная форма. Філасофія санета (паводле І.Бехера). Артыкул М.Багдановіча “Санет”. Санеты Ф. Петраркі – першапачынальніка лірычнай паэзіі. Санеты Шэкспіра.

Беларускія пераклады санетаў, ілюстрацыі беларускіх мастакоў (Г.Паплаўскі, В.Мікіта).

**Навела**: паходжанне назвы, традыцыі ў ёй іншых жанраў. Стваральнік навелы Адраджэння Дж. Бакача – раман у навелах “Дэкамерон”. М. Сервантэс – “Павучальныя навелы”.

Тыпалагічная паралель жанру – авантурна-навелістычныя казкі ў беларускім фальклоры (“За што мужык папу бараду агаліў”, “Сцізорык зламаўся, або Асцярожны пасланец”, “Мужык, пан і ксёндз”, “Несцерка” і інш.). “Ліцэнцыят Відрыера” Сервантэса ў беларускім перакладзе.

**Народныя кнігі**: асаблівасці стварэння і распаўсюджвання. Нямецкія – “Займальная кніжка пра Ціля Эйленшпігеля”, “Гісторыя пра д-ра Ёгана Фаўста, знакамітага чараўніка і чарнакніжніка”, “Шыльдбюргеры”: кантэкст “літаратуры пра дурняў” (у т.л. вобразы “дурных людзей” у беларускіх казках, напр. у казцы “Дурныя людзі”).

## Тэма 2.7. Тытаны Адраджэння

**Пантэон сусветнай класікі Адраджэння** (Ф.Петрарка, Дж.Бакача, М.Баярда, Л.Арыёста, Т.Таса, Ф.Рабле, М.Мантэнь і інш.).

**Шэкспір.**“Шэкспіраўскае пытанне”:стрэдфардыянская і нестрэдфардыянская версіі. Асаблівасці мастацкага метаду. Перыядызацыя жыцця і творчасці. Санеты, камедыі, трагедыі, трагікамедыі, хронікі. Структура мастацкага свету твораў Шэкспіра: вобразы чалавека, сям’і, грамадства, дзяржавы, вышэйшай асобы-ўладара, часу-эпохі, Сусвету.

Шэкспір – цэнтр літаратурнага канона. Шэкспіразнаўства. Гамлеталогія.

**Сервантэс.** Легендарная біяграфія пісьменніка. “Дон Кіхот”: кампазіцыя рамана. Тры іпастасі і сутнасць вобраза загалоўнага героя. Дон Кіхот і Санча Панса: паасобку і разам. Вобраз Дульсінеі.

Паняцце донкіхоцтва. Вечны вобраз Дон Кіхота.

## Тэма 2.8. Нацыянальныя асаблівасці Адраджэння ў краінах Еўропы

**Італьянскае** Адраджэнне: літаратура Трэчэнта (паэзія “новага пяшчотнага стылю”, Дантэ, Петрарка, Бакача), Кватрачэнта (М.Баярда “Закаханы Раланд”), Чынквечэнта (Л.Арыёста “Неўтаймаваны Раланд”, працяг паэмы М.Баярда і самастойны твор, Т.Таса “Вызвалены Іерусалім”).

Асаблівасці гуманізму ў **Германіі і Нідэрландах**. “Лісты цёмных людзей”. Ульрых фон Гутэн (традыцыі філасофскага дыялогу). Літаратура перад Рэфармацыяй і часоў Рэфармацыі, Вялікай сялянскай вайны. Галандскі (з Нідэрландаў) вучоны-гуманіст Эразм Ратэрдамскі і яго роля ў пашырэнні ідэй Адраджэння (у творчасці С.Буднага і інш.). “Пахвала Дурноце”.

**Французскае** Адраджэнне. Папярэднікі. Пераклады Біблii. “Плеяда” і яе лідэр П. Рансар. Проза: Маргарыта Наварская (“Гептамерон”). Ф. Рабле: складанасць жыццёвага і творчага шляху. Раман “Гарганцюа і Пантагруэль”: амбівалентнасць, карнавалізацыя вобразаў (кніга М.Бахціна “Франсуа Рабле і народная культура Сярэднявечча і Рэнесанса”). Першапачынальнік літаратурнай формы эсэ М. Мантэнь.

**Англійскае** Адраджэнне. Пачатак творчасці Дж.Чосера. Пераклад Біблii ў XIV ст. Проза XV ст. Творы Т. Мэлары: празаічная кампіляцыя легенд пра караля Артура ў эпапеі “Смерць Артура”. Росквіт паэзіі і драмы ў ХУІ ст.

**Іспанскае** Адраджэнне. “Залатое стагоддзе” іспанскай драматургіі: Лопэ дэ Вэга, Тырса дэ Маліна – яго першыя прадстаўнікі. Проза.

**Партугальская** літаратура: Луіс дэ Камоэнс.

**Адраджэнне ў славян.** Неалацінская літаратура. Яе распаўсюджванне: Чэхія, Польшча, ВКЛ. Паэт Далмацыі Марка Маруліч. Ян Длугаш і “Гісторыя Польшчы”. Польска-лацінскія паэты. Цэнтры гуманістычнай культуры (у Далмацыі, Чэхіі, Польшчы). Прага як культурны асяродак. Кнігадрукаванне.

Літаратура на нацыянальных мовах. Паэзія на сербска-харвацкай мове. Першыя творы на чэшскай мове. Фарміраванне нацыянальнай паэзіі на польскай мове. Апора на народныя традыцыі. М. Рэй – "бацька польскай пісьменнасці". Я. Кахаnoўскі: польская трагедыя на антычны сюжэт "Адмаўленне грэчаскім паслам", цыкл плачаў-элегій "Трэны". "Песнь на Івана Купалу": спроба перанясення антычных традыцый на нацыянальную глебу. Фрашкі і іх роля ў развіцці жанру эпіграмы.

### Тэма 2.9. Літаратура краін Усходу: Сярэднявечча і Адраджэнне

**Арабская літаратура.** Старажытная арабская паэзія ("муалакі", "касыда"). Узнікненне іслама і Каран. Арабская любоўная лірыка Ранняга Сярэднявечча: два кірункі хіджаскай лірыкі пра каханне: бедуінскі (блізкасць з паэзіяй трубадураў) і гарадскі. Амар ібн Абі Рабіа – "Дон Жуан Меккі", "Авідзій Аравіі і Усходу". Перыяд Сталага Сярэднявечча: казкі "Тысячы і адной ночы" (тыпалагічнае падабенства са зборнікам Я. Баршчэўскага "Шляхціц Завальня"). Узнікненне жанру макамы (сціслай махлярскай навелы, тыпалагічныя сыходжанні з творамі заходнееўрапейскай гарадской літаратуры).

**Літаратура Ірана і Сярэдняй Азіі**. Рудакі – першапачынальнік класічнай паэзіі персаў. Цікавасць да іранскай даўніны: эпапея Фірдаўсі "Шах-намэ" (тры часткі "Кнігі пра цароў"). Персідска-таджыкская літаратура: Гургані "Віс і Рамін": тыпалагічныя сыходжанні з легендай пра Трыстана і Ізольду. Вяршыня гуманізму – паэзія Амара Хаяма. З літаратуры XIV ст.: Гафіз.

**Кітайская паэзія** эпохі Тан: Лі Бо, Ду Фу. Пераклады на беларускую мову: узбагачэнне пейзажнай лірыкі ўсходнімі матывамі. Філасофскі роздум пра сэнс чалавечага жыцця, сацыяльныя вобразы, спецыфіка іх прачытання.

## Раздзел 3. Сусветная літаратура XVII і XVIII стст.

### Тэма 3.1. XVII стагоддзе і літаратурны працэс. Барока

Крызіс гуманізму. Літаратурная барацьба. Фарміраванне асноўных літаратурных кірункаў. **Барока** як мастацка-эстэтычная сістэма. Барока ў **Іспаніі**: П. Кальдэрон, яго рэлігійна-філасофскія (гісторыка-філасофскія) драмы. Жанр махлярскага рамана ў іспанскай літаратуры. Барока ў **Германіі**: паэзія Трыццацігадовай вайны (М.Опіц, П.Флемінг, А.Грыфіус, Ф.Логау, народная песня): асноўныя матывы, вобразы. Раман Грымельсгаўзена "Сімпліцысімус": двоістасць чалавека і свету.

Пераклады на беларускую мову. Барока ў славян і беларусаў. Буйнейшы прадстаўнік – Сімяон Полацкі. "Высокае" і "нізкае" барока.

### Тэма 3.2. Класіцызм

Філасофская аснова – картэзіянства. Гістарычныя этапы ў развіцці класіцызму ў Францыі. Тэорыя класіцызму Н. Буало. Оды Ф. Малерба, байкі Ж.

Лафантэна. Маральная праблематыка у прозе французскіх класіцыстаў: М. Лафайет (“Прынцэса Клеўская”), Б. Паскаль (“Думкі”), Ф. Ларашфуко (“Максімы”), Ж. Лабруер (“Характары, або Норавы нашага стагоддзя”). Жанры трагедыі (П. Карнель, Ж. Расін) і камедыі (Мальер). “Сід” Карнэля як узор літаратуры класіцызму 1-га перыяду. “Андрамаха” Расіна – новая канцэпцыя ў класіцызме 2-га перыяду.

**Мальер**: асноўныя этапы жыцця і творчасці. Драматургічная рэформа Мальера. Камедыі “Скупы”, “Тарцюф”, “Мешчанін у дваранах”, “Дон Жуан” і іншыя: традыцыйнае і наватарскае.

Камедыі Мальера на беларускай сцэне. Перайманне сюжэтаў і вобразаў Мальера ў п’есах беларускіх аўтараў (Ф.Уршуля Радзівіл і інш.).

**Літаратура Англіі.** Традыцыі барока і класіцызму. Дж. Мільтан*:* звесткі з жыцця і творчасці. Паэма “Страчаны рай”. “Ад вовне и Ад внутри”: Сатана. Вобразы Адама і Евы, матывы спакушэння і грэхападзення. Тэматыка “Вернутага раю”.

## Тэма 3.3. XVIII стагоддзе: Асветніцтва

XVIII стагоддзе і яго месца ў гісторыі сусветнай літаратуры. Асветніцтва як комплекс ідэй у культурным руху Еўропы. Сувязь літаратуры з філасофіяй і эстэтыкай. Асноўныя літаратурныя кірункі. Водгукі **барока** ў камедыях плашча і шпагі К. Гоцы, жанр тэатральнай казкі – ф’ябы. Мастацтва **ракако** (паэзія кахання Э. Парні, элементы ў “Арлеанскай нявінніцы” Вальтэра). **Асветніцкі класіцызм**: роля грамадства, ідэя выхавання чалавека. Новы тып героя – мудраца, інтэлектуала (Вальтэр, “Рымскія элегіі” Гётэ). **Асветніцкі рэалізм**: вывучэнне сацыяльнага становішча чалавека і яго лёсу ў грамадстве, сацыяльна актыўны герой, дзейснае адстойванне ім сваіх інтарэсаў, герой як прадстаўнік свайго саслоўя, праблема яго эвалюцыі. **Сентыменталізм** як напрамак Сталага Асветніцтва: культ пачуццяў, культ прыроды, ідэалізацыя патрыярхальнага сялянскага ладу, непрыманне цывілізацыі і горада як крыніцы заганаў асобы і грамадства. **Перадрамантызм** – умоўная назва пераходных літаратурных з’яў (стваральнікі “гатычнага рамана” Г. Уолпал, Г. Радкліф; “Паэмы Асіяна” Дж. Макферсана паводле гэльскага фальклору Шатландыі). Жанравая характарыстыка літаратуры Асветніцтва.

**Асветніцтва ў славян**. Яго антыфеадальны, антыкаталіцкі характар (Польшча), насычанасць ідэямі нацыянальнага вызвалення: супраць аўстрыйскага абсалютызму (Чэхія), турэцкага прыгнёту (Сербія, Балгарыя), як процістаянне прыгону і самаўладдзю (Расія). Асветніцкая літаратура на беларускіх землях.

## Тэма 3.4. Асветніцтва ў Англіі

**Англійскі раман** – «классический, старинный, отменно длинный-длинный-длинный, нравоучительный и чинный» (А.Пушкін). Раман прыгод і падарожжаў**. Д. Дэфо** “Рабінзон Круза”. Раман **Дж. Свіфта** “Падарожжы Гулівера”. Жанр сентыментальнага рамана: **Л. Стэрн** “Сентыментальнае падарожжа па Францыі і Італіі”. **Р. Бёрнс**. Аўтабіяграфічныя матывы ў лірыцы Р. Бёрнса. Паэзія як

летапіс роднага краю і біяграфія Часу. Героі Бёрнса. Тэма кахання. Жанравае багацце: вершы, эпіграмы, музычна-драматычны жанр кантаты і інш.

Дэфо і Свіфт па-беларуску. Рабінзанада ў сусветнай літаратуры (у т.л. "Палескія рабінзоны" Я.Маўра). Пераклады на беларускую мову, тыпалагічныя сыходжанні. Песні на словы Р. Бёрнса.

## Тэма 3.5. Асветніцтва ў Францыі

**Асветніцтва ў Францыі.** Грамадска-палітычнае значэнне дзейнасці французскіх асветнікаў: Вальтэр і вальтэр'янства, Дзідро і "Энцыклапедыя", Русо і русаізм. Філасофскія аповесці **Вальтэра**. Уплыў вальтэр'янства на развіццё філасофскай, сацыяльна-палітычнай думкі ў Беларусі. **Д. Дзідро** – прадстаўнік рэалістычнага мастацтва ў драматургіі і прозе, у тэорыі асветніцкага рэалізму. **Ж.Ж.Русо** – прадстаўнік сентыменталізму. Першыя сацыяльна-палітычныя камедыі ў французскай літаратуры: "Севільскі цырульнік, або Марная перасцярога" і "Вар'яцкі дзень, або Жаніцьба Фігаро" **П.А.К. Бамаршэ**.

Пастаноўкі оперы Дж. Расіні "Севільскі цырульнік" і В.А. Моцарта "Жаніцьба Фігара" на беларускай сцэне (пераклад апошняй на беларускую мову ў 1936 г. А. Дударом). Асветніцтва ў Францыі як адна з перадумоў Вялікай французскай рэвалюцыі 1789 – 1794 гг., яго ўплыў на жыццё тагачаснай Еўропы (у т.л. на Беларусь).

## Тэма 3.6. Асветніцтва ў Германіі

Поспехі нямецкага Асветніцтва ў галіне філасофіі і тэорыі мастацтва. Тэарэтык і практык рэалістычнага мастацтва – **Г.Э. Лесінг**. Нацыянальна-культурны рух "Бура і націск" – этап асветніцкай літаратуры. Гётэ і Шылер як прадстаўнікі шцюрмерства (старонкі з біяграфіі).

**Ф.Шылер.** Шляхі да справядлівай грамадскай пабудовы ў творчасці нямецкага асветніка: індывідуальны бунт ("Разбойнікі"), народнае паўстанне ("Змова Фіеска ў Генуі"), выхаванне манарха ("Дон Карлас"). Перыяд веймарскага класіцызму ў творчасці Шылера і Гётэ (канцэпцыя эстэтычнай адукацыі і выхавання; 1797 – год балад). Шылер як адзін з найбольш вядомых драматургаў свету.

**І.В.Гётэ.** Перыядызацыя жыцця і творчасці. Гётэ – паэт-лірык (балада "Лясны цар", пераклады па-беларуску). Гётэ – празаік (раман "Пакуты маладога Вертэра"). Трагедыя "Фаўст": з гісторыі вечнага вобраза, спецыфіка яго распрацоўкі ў творчасці Гётэ. Пошукі Фаўстам сэнсу чалавечага жыцця і ўласнага прызначэння, пошукі Ісціны. "Спакушэнні" на шляху героя. Фаўст і Мефістофель. Фаўст і Вагнер. Фаўст і Маргарыта. Фаўст і Алена Спартанская. Эвалюцыя вобраза загалоўнага героя. Канкрэтна-гістарычны змест і вечны сэнс вобраза Фаўста.

Перастварэнне вобразаў рамана "Пакуты маладога Вертэра" (В.А. Моцарт "Сімфонія № 40, Вертэраўская", У. Пленцдорф "Новыя пакуты маладога Вертэра" і інш.). Вертэраўскі тып героя. Гётэ і выяўленчае мастацтва (ілюстрацыі да твораў Гётэ, у т.л. А. Кашкурэвіча: новае прачытанне трагедыі "Фаўст" у ХХ ст.). Гётэ і тэатр (1860-я гады як час пачатку шырокага знаёмства з творамі нямецкага драматурга на Беларусі. Пастаноўкі XIX – XX стагоддзяў). Гётэ і музыка: опера Ш. Гуно "Фаўст", опера Ж. Маснэ "Вертэр". Гётэ па-беларуску. Афарызмы, цытаты з Гётэ. Прысвячэнні Гётэ.

# Раздзел 4. Сусветная літаратура 1-й пал. XIX ст. (рамантызм)

## Тэма 4.1. Сусветная літаратура 1-й паловы XIX ст.: агульная характарыстыка. Рамантызм

Вылучэнне гістарычных перыядаў: асноўныя літаратурна-мастацкія крытэрыі. Новы этап у развіцці сусветнага літаратурнага працэсу. Складванне асноўных літаратурных кірункаў (рамантызм, рэалізм) у еўрапейскіх літаратурах. Фарміраванне **рамантызму** пад уплывам сацыяльна-палітычных падзей у 2-й палове 1790-х гадоў (Германія, Англія, Францыя), 1800-я гады (Італія, Іспанія, Расія), паўсямеснае яго распаўсюджванне ў 1830 – 40-я гады. Эстэтычныя перадумовы, філасофскае абгрунтаванне ідэй рамантыкаў. Рамантызм як літаратурна-мастацкі кірунак.

Сінтэз мастацтваў у рэчышчы рамантычнага светаўспрымання: літаратуры і музыкі (песні Ф. Шуберта на словы В. Мюлера: цыклы "Прыгожая млынарка", "Зімні шлях"; вакальныя цыклы Р. Шумана на словы Г. Гейнэ, А. Шаміса, музыка да "Манфрэда" Дж.Г.Н. Байрана), літаратуры і жывапісу (В. Ваньковіч "А.Міцкевіч на скале Аю-Даг", уплыў "Крымскіх санетаў" на беларускага мастака) і інш.

## Тэма 4.2. Рамантызм у літаратуры Германіі

Праграмныя працы ("Фрагменты" Ф. Шлегеля). Мастацтва як вышэйшая ступень разумення свету. Самы важны яе від – музыка. Вобраз паэта ў рамане Наваліса "Генрых фон Офтэрдынген".

**Паэзія нямецкага рамантызму.** Вершы, прысвечаныя старажытнай Эладзе і хрысціянству (Ф. Гёльдэрлін). Паэты Гейдэльбергскай школы: К. Брэнтана і Арнім. Цыкл балад "Нямецкія народныя паданні" А. Шаміса, паэтычны цыкл "Каханне і жыццё жанчыны" (музыка Р. Шумана). Паэзія і музыка ў творчасці Ё. Айхендорфа. Жыццёвы і творчы шлях В. Мюлера: сувязь з народам, трагічнасць жыцця.

"Песнярова праклящце" Л. Уланда і "Курган" Я. Купалы: вобразы ваяўнічых тыранаў-уладароў, мужных і праўдзівых песняроў, тэматыка песень вандроўных спевакоў, аўтарскае слова ў творах. "Катрыншчык" Мюлера на музыку Шуберта і беларускі пераклад. Кніга перакладаў нямецкіх паэтаў-рамантыкаў па-беларуску – "Закаханы вандроўнік" (Мн., 1989): тыпалагічная блізкасць нямецкай паэзіі матывам і вобразам беларускай лірыкі.

**Проза нямецкага рамантызму**: браты Грым, Генрых фон Клейст (у т.л. драматургія апошняга). Уплыў музыкі і жывапісу на творчасць Э.Т.А. Гофмана: казкі і лібрэта ("Шчаўкунок" як аснова для "Казак Гофмана" французскага кампазітара Ж. Офенбаха). Фантастычнае і рэальнае ў свеце Гофмана.

Пераклады Гофмана па-беларуску, пастаноўкі на беларускай сцэне.

## Тэма 4.3. Рамантызм у літаратуры Англіі

Нацыянальныя асаблівасці рамантызму. Росквіт паэзіі і асновы рамантычнай літаратуры ў паэзіі "Азёрнай школы". Проза: В. Скот – стваральнік жанру гістарычнага рамана.

**Дж. Н. Г. Байран**. Жыццёвы і творчы шлях. Паэзія ў кантэксце сацыяльных праблем тагачаснай Еўропы: сатырычнае выкрыццё буржуазнага грамадства, адлюстраванне гістарычных падзей (нацыянальна-вызваленчая барацьба народаў Еўропы, апакаліптычныя матывы гібелі). Паэма “Шыльёнскі вязень”. Вечныя вобразы ў творах (Праметэй, Дон Жуан). Вобразы тытанаў сусветнай культуры (“Прароцтва Дантэ”). Матывы адчаю і адзіноты (“Стансы да Аўгусты” – “Калі згасіў праменне змрок...”), пачуцці асуджанасці і працяг жыцця (“Змрок на душы маёй...”), філасофскі роздум над сутнасцю існавання – спалучэнне гэтых тэм і матываў у “Паломніцтве Чайльда Гарольда”.

Байранізм як спецыфічны кірунак еўрапейскай рамантычнай думкі. Сацыяльна-рэвалюцыйныя, нацыянальна-вызваленчыя матывы ў творчасці Дж. Байрана і Я. Купалы. Уплыў байранізму на беларускую паэзію. Прысвячэнні Байрану: Я. Лучына, У. Караткевіч.

## Тэма 4.4. Рамантызм у літаратуры Францыі

Проза: узнікненне жанру рамана-споведзі (аповесці “Атала”, “Рэне” Ф.Р. Шатабрыяна, “Адольф” Б. Канстана, “Споведзь сына стагоддзя” А. дэ Мюсэ), спецыфіка гістарычнага рамана (“Сен-Мар” А. дэ Віны, раманы А. Дюма), жанр сацыяльнага рамана (Жорж Санд).

**В. Гюго.** Прадмовы да драмы “Кромвель” як літаратурны маніфест французскага рамантызму. Жанр гістарычнага рамана ў творчасці В. Гюго. Раман “Сабор Парыжскай Божай Мацеры”: зварот да гістарычнага мінулага, нацыянальнай гісторыі. Вобраз Сабора – раманскае і гатычнае, “мясцовы каларыт”, сімволіка вобразаў, Сабор як галоўны герой рамана. Супастаўленні і проціпастаўленні дзеючых асоб, выключнасць характараў і выключнасць абставін. Сінтэз мастацтваў. Паэзія Гюго: успаміны, роздум, адлюстраванне падзей жыцця (“Сейбіт”, “Захад сонца”, “На барыкадзе”).

## Тэма 4.5. Рамантызм у літаратуры Польшчы

**А. Міцкевіч** – заснавальнік рамантызму ў польскай літаратуры. Народныя вытокі светаўспрымання і казачна-паэтычны свет балад Міцкевіча (“Балады і рамансы” як паэтычны маніфест). Зварот да традыцый мінулага, развіццё рамантычнай канцэпцыі героя (“Гражына”), героя “вертэраўскага” тыпу (“Дзяды”). Наватарства санетнай формы. “Пан Тадэвуш” – энцыклапедыя жыцця польска-беларускай шляхты напачатку XIX ст. Шматбаковасць і глыбіня сувязей Міцкевіча і Беларусі. Інтэрпрэтацыя сюжэтаў і вобразаў Міцкевіча дзеячамі беларускай культуры. Ушанаванне памяці паэта на Беларусі.

Прадстаўнік (з сяр. 1830-х г.) польскага рамантызму **Ю. Славацкі**.

## Тэма 4.6. Рамантызм у літаратуры ЗША

**Проза**: распрацоўка жанру рамана (гістарычнага, прыгодніцкага, марскога, бытавога) ў творчасці Ф. Купера. Пачынальнік жанру дэтэктыўнай прозы Э. По, майстэрства навелы: атмасфера жахлівага, пранíклівасць героя і інш. **Паэзія**: Э.По – тэма адчаю і смутку ў вершах, “страшнае” ў “натуральным”, паводле В. Брусава (паэма “Крумкач”), памяць пра жонку, якую страціў (паэма “Анабель Лі”). Услаўленне патрыярхальнага мінулага ў творчасці Г. Лангфэла – “Спеў аб

Гаяваце” – “індзейская Эда”, гістарычнае і міфалагічнае ў паэме. Рамантычная туга па казачнаму мінуламу. Нацыянальныя асаблівасці рамантызму ў літаратуры ЗША.

## Раздзел 5. Сусветная літаратура 2-й пал. XIX ст. (рэалізм)

### Тэма 5.1. Сусветная літаратура 2-й паловы XIX ст.: агульная характарыстыка. Рэалізм

Літаратура 2-й паловы XIX ст.: агульная характарыстыка.

Літаратура **рэалізму** ў XIX ст.: тыпалогія літаратурнага кірунку. Паняцце “крытычны рэалізм”. Філасофія пазітывізму як адна з асноў зараджэння і развіцця рэалістычнай літаратуры. Асноўная формула, спасціжэнне законаў фарміравання асобы пад уплывам асяроддзя. Сувязі з філасофіяй, прыродазнаўчымі навукамі. Асноўныя прынцыпы (праўдзівасць, гістарызм, псіхалагізм, навуковае вывучэнне і інш.). Мара пра ідэал (у сацыяльных нізах), крушэнне ілюзій (у т.л. на разумовую пабудову грамадства). Асноўны канфлікт. Сінтэз традыцый. Роля мастацкай дэталі (падрабязнасцей быту, пейзажа, партрэта, жэста, суб’ектыўных рэакцый, мовы, інтэр’ера).

### Тэма 5.2. Рэалізм у літаратуры Францыі

Паэзія: **П.Ж. Беранжэ.** Проза – **Ф. Стэндаль**. Вывучэнне “італьянскага характару” ў кантэксце тагачасных палітычных падзей (навела “Ваніна Ваніні”). Працяг пошукаў чалавекам моцных пачуццяў. Тэма страчаных ілюзій у святле рэалістычнага вывучэння рэчаіснасці: раман “Чырвонае і чорнае” як “хроніка XIX стагоддзя”. **П.Мерымэ** – гістарычныя сюжэты, майстэрства рэалістычнага апавядання ў навелах “Матэо Фальканэ” і “Кармэн” (як аснова оперы французскага кампазітара Ж. Бізэ “Кармэн”).

**Бальзак.** Гісторыя Францыі перыяду Рэстаўрацыі і ліпеньскай манархіі ў творах Бальзака. Задума і план “Чалавечай камедыі”, асаблівасці яе ажыццяўлення. Вечны вобраз скупога. Габсэк Бальзака: спалучэнне рэалістычнага і рамантычнага, высокага і нізкага, гіпербалізацыі і індывідуалізацыі вобраза. Майстэрства Бальзака-псіхолага, мастака (рэмбрантаўскі партрэт), роля колеру і гуку ў структуры мастацкага вобраза.

Балет “Кармэн-сюіта” Бізэ – Р. Шчадрына на сцэне Нацыянальнага тэатра балета (з 1974), у Тэатры музычнай камедыі. Французскія пісьменнікі-рэалісты і славянскі свет (удзел Стэндаля ў напалеонаўскіх паходах падчас рускай кампаніі, перапіска Бальзака з Эвелінай Ганскай і жаніцьба з ёй; зборнік празаічных балад Мэрымэ “Гузла, або Зборнік ілірыйскіх песень, запісаных у Далмацыі, Босніі, Харватыі і Герцагавіне”, стылізацыя на аснове фальклорных крыніц). Уплыў бальзакаўскіх традыцый на станаўленне і развіццё беларускага рамана (Я. Колас, І.Мележ).

## Тэма 5.3. Рэалізм у літаратуры Англіі

Віктарыянства як перыяд і лад жыцця, ідэалогія і духоўная атмасфера. Прадстаўнікі т.зв. “бліскучай плеяды”: Ч. Дзікенс, У. Тэкерэй, сёстры Брантэ. Адлюстраванне заганаў віктарыянскай Англіі ў раманах **Ч. Дзікенса**. Цяжкасці жыццёвых выпрабаванняў, што выпалі на долю героя, перамога дабра і пакаранне зла ў рамане “Прыгоды Алівера Твіста”. Іншыя “выхаваўчыя” раманы пісьменніка. Асаблівасці меладраматызму ў творчасці Дзікенса, тыпалагічныя паралелі з яго элементамі ў беларускай літаратуры (вастрыня інтрыгі і перабольшванне эмацыянальнасці, рэзкае супрацьстаянне дабра і зла і маралізатарскія тэндэнцыі і інш.). “Ярмарка пыхлівасці” **У. Тэкерэя**: сацыяльна-палітычныя, маральныя праблемы, іронія і сатыра ў творы, праблема “рамана без героя”. Раман **Ш. Брантэ** “ Джэн Эйр”.

## Тэма 5.4. Рэалізм у літаратуры Германіі

“Эстэтыка” Гегеля і яе роля ў гісторыі сусветнай культуры. **Г.Гейнэ:** з гісторыі жыцця і творчасці. Рамантычныя традыцыі ў паэзіі, рэалістычнае светаадчуванне. “Кніга песень” (“Ларэлей” і інтанацыя нямецкіх народных песень; “У паўночным краю на кургане...” і “Калі любоў ізмучыць...” у перакладзе М. Багдановіча). Трагічнасць вобразаў “Двайніка” (з гэтага ж зборніка) у музыцы Ф. Шуберта. Іх роля ў станаўленні нямецкай рамантычнай вакальнай лірыкі. Узоры палітычнай лірыкі ў зборніку “Сучасныя вершы” (“Генрых” у пер. М. Багдановіча) і паэме “Германія. Зімовая казка” (пер. на бел. мову 1939, выд. 1959). Зборнік “Раманцэра”: традыцыйнае і новае (“Ход жыцця” ў пер. М. Багдановіча), трагічныя ўмовы жыцця падчас стварэння зборніка.

Вобразы паэзіі Гейнэ ў музыцы: у “Песнях без слоў” Мендэльсона (асабістае знаёмства з паэтам у салоне бацькоў у Берліне), блізкасць паэзіі Гейнэ і музыкі Р. Шумана: уплыў паэта на фарміраванне раманснага стылю кампазітара, цыкл “Каханне паэта” (на 16 з 56 вершаў): аднаўленне гісторыі кахання і ўсіх яе глыбінных пачуццяў. Знаёмства Гейнэ з Шапэнам, балада Шапэна (3-я Ля-мажор) звязана, верагодна, з “Ларэлеяй”. Рамансы П. Падкавырава на словы Гейнэ (“Дзяцюк шчыра любіць дзяўчыну..”, “Бедны Пётр”, “Дружа мой”, “Той, хто першы раз кахае...” і інш.). Кніга С. Вальфсона “У матрацнай магіле” (Мн., 1940, на рускай мове), прысвечаная апошнім гадам жыцця Гейне.

## Тэма 5.5. Рэалізм у Польшчы і на Украіне

**Ю. Крашэўскі** – тэарэтык і практык польскага рэалізму. Малюнкі і падзеі з жыцця беларускага і ўкраінскага прыгоннага сялянства ў аповесцях з народнага жыцця (“Ульяна”, “Астап Бандарчук”), побыт, пейзажныя замалёўкі, жыццё, культура.

**Т.Р.Шаўчэнка**: шматбаковасць таленту і трагічныя абставіны лёсу паэта, мастака, мысліцеля. Пратэст супраць прыгнёту і зла, ідэі сялянскай рэвалюцыі, адзінства славянскіх народаў. Вобраз Кабзара як варыянт вечнага вобраза музы'кі. Лёс прыгоннага інтэлігента, ідэя духоўнага адзінства паэта і народа. Вобраз Праметэя як сімвал бессмяротнасці народа-тытана. Тэма радзімы, матывы народнай творчасці. Рамантычныя і рэалістычныя тэндэнцыі ў творчасці Т. Шаўчэнкі. Паэтычнае “Завяшчанне” Кабзара. Т. Шаўчэнка – мастак.

Спадчына паэта-мастака ў кантэксце беларускай культуры: прысвячэнні, пераклады, ушанаванне памяці. Жыццёвы вобраз Кабзара як асновы паэмы Я. Купалы “Тарасова доля”.

# Раздзел 6. Сусветная літаратура апошняй трэці XIX – пач. XX ст.

## Тэма 6.1. Літаратура рэалізму

**Рэалізм.** Рэалістычная літаратура – класіка XIX стагоддзя. Аналіз узаемаўплыву чалавека і асяроддзя. Псіхалагічны аналіз асобы. Крытыка сацыяльнага зла і заганаў грамадства, дэмакратычныя, гуманістычныя ідэалы. Філасафічнасць апавядання. Гратэск і фантастыка. Жанры сацыяльна-псіхалагічнага рамана і драмы (Р. Ралан, Б. Шоу, Дж. Голсуорсі, Т. Драйзер), рамана выхавання (Г. Ман., Т. Ман), філасофскага рамана ідэй (А. Франс) і філасофскай драмы (Г. Ібсэн), сацыяльна-утапічнага рамана (Г. Уэлс) і інш. Рэвалюцыйна-пралетарская і сацыялістычная літаратура. Літаратура Парыжскай Камуны: паэзія (Э. Пацье і яго “Інтэрнацыянал”, Л. Мішэль), проза. Раман Э.Л.Войніч “Авадзень”. Літаратура рэалізму ў еўрапейскіх краінах і ЗША.

**Рэалізм у літаратуры Францыі. А. Франс**: іронія і парадокс у “Злачынстве Сільвестра Банара”, пародыя на гісторыю чалавецтва і афіцыйную гістарыяграфію (“Востраў пінгвінаў”). Праблема гвалту і гуманізму, вобразы Рэвалюцыі, філасофскія высновы ў рамане “Богі прагнуць”. Адметнасць стылю А. Франса. **Р. Ралан**: спалучэнне музыкі і слова, мара пра гераічнае мастацтва. “Жан-Крыстоф” – раман-эпапея, герой якога – “Бетховен у нашым сучасным свеце”. Традыцыі рамана выхавання, праблема творчай асобы і вызначэнне свайго месца ў грамадстве. “Гальскі выклік вайне” (М. Горкі), заклік да шчасця, міру, працы, жыцця ў аповесці “Кала Бруньён”.

**Рэалізм у літаратуры ЗША. Т. Драйзер**: асаблівасці жыццёвага і творчага шляху як правобраз ажыццяўлення “амерыканскай мары”. Традыцыі рэалізму і натуралізму. Т.зв. “жаночы” варыянт “амерыканскай мары” – у раманах “Сястра Кэры” і “Джэні Герхард”; “мужчынскі” варыянт – “Трылогія жадання” (“Фінансіст”, “Тытан”, “Стоік”). Сацыяльная трагедыя Клайда Грыфітса як адлюстраванне новага перыяду ў развіцці капіталістычных адносін у ЗША, прычыны “амерыканскай трагедыі” (у аднайменным рамане). Драйзер у СССР.

Традыцыі рэалізму ў **драматургіі** мяжы стагодзяў. Шырокае знаёмства з творчасцю замежных драматургаў на Беларусі ў XX ст. Філасофска-сімвалічныя драмы “Бранд” і “Пер Гюнт” **Г. Ібсэна**, яго сацыяльна-аналітычныя п’есы “Лялечны дом, або Нора”, “Здані”, “Вораг народа” і інш. **Б. Шоу** як тэатральны крытык і драматург. Парадокс, сатыра, эксцэнтрыка, фарс у п’есах “Пігмаліён”, “Дом, дзе разбіваюцца сэрцы” і інш. Асаблівасці драмы-дыскусіі.

## Тэма 6.2. Літаратура натуралізму

Натуралізм як літаратурны кірунак, сувязь з рэалізмам. Ідэі пазітывізму і поспехі прыродазнаўчых навук – аснова яго зараджэння і развіцця. Натуралізм як метад: адмаўленне ад тыпізацыі і абагульненняў, фактаграфічнасць і капіраванне рэчаіснасці, захапленне дэталлю, асобнымі фактамі, строгая навуковасць адлюстравання, біялагізм – увага да фізіялагічных з’яў і тэорыі спадчыннасці, цікавасць да паталогіі і эротыкі і інш. “Тэрэза Ракен” **Э. Заля** як уласна натуралістычны раман. 20-томны цыкл яго раманаў “Ругон-Макары”

(падзагаловак “Натуральная і сацыяльная гісторыя адной сям’і ў эпоху Другой імперыі”): гісторыя ўзнікнення сям’і (“Кар’ера Ругонаў”), узвышэнне яе да класу буржуазіі (“Грошы”, “Яго вялікасць Эжэн Ругон”, “Дамскае шчасце”, “Здабыча”) і зніжэнне па сацыяльнай лесвіцы (“Западня”, “Жэрміналь”, “Зямля”, “Нана”).

## Тэма 6.3. Дэкаданс

**Філасофія дэкадансу** і яе ўплыў на літаратуру. Інтуітывізм А. Бергсона: тэорыя мастацкай творчасці. Дэкаданс як складанае светаўспрыманне эпохі пераходу ад росквіту да крызісу і заняпаду буржуазнага грамадства, рэакцыя на крызіс сацыяльна-палітычны, традыцыйных каштоўнасцей, адмаўленне ад навуковага пазнання свету і бачанне “іншай”, “вышэйшай” рэчаіснасці, амаралізм, фармалізм і наватарства ў мове і стылі. Сінтэз мастацтваў у рэчышчы літаратуры дэкаданса. Літаратурна-мастацкія кірункі.

**Эстэтызм.** Тэорыя ў літаратуры і мастацтве, дзе мастацтва дэкларуецца вышэйшым за жыццё і здольным, апераджаючы, фарміраваць жыццё. Пазбаўленне мастацтва яго функцый – палітычнай, маральнай, выхаваўчай, рэлігійнай і інш., акрамя эстэтычнай. Ідэі эстэтызму ў тэорыі **О. Уайльда** (праца “Выдумкі”) і ў рамане “Партрэт Дарыяна Грэя”. Казкі Уайльда. Трагізм жыццёвага лёсу пісьменніка, адлюстраванне яго ў “Баладзе Рэдзінгскай турмы” (пераклад на бел. мову яго ўрыўка) і ў лісце “De profundis” (“З глыбіні...”).

**Сімвалізм.** Вера ў існаванне двух рэчаіснасцей, паміж якімі існуюць сувязі-адпаведнасці, якія спрыяюць спасціжэнню іншага свету з дапамогай інтуіцыі (Бергсон), маўчання (Метэрлінк), музыкі (Верлен), жывапісу (“афарбоўкі галосных” А. Рэмбо) і інш. Метад адпаведнасцей. Асноўныя матывы, тэмы, фармальныя адзнакі стылю. **Імпрэсіянізм.** Ключавыя паняцці: шматфарбнасць і зменлівасць жыцця, імгненнасць уражанняў. Зараджэнне ў жывапісе Францыі ў 1860-я гады. Перыяд станаўлення (Эдгар Манэ), росквіту (Клод Манэ, Э. Дэга, К. Пісаро, А. Рэнуар), неаімпрэсіянізму (А. Сіслей, П. Сіньяк), постімпрэсіянізму (П. ван Гог, П. Гаген, А. Тулуз-Латрэк, А. Радэн, П. Сезан). Імпрэсіянізм у музыцы (часткова М. Равель, упершыню паняцце выкарыстана ў дачыненні да твораў К. Дэбюсі, “Прэлюдыя да “Пасляпаўднёвага адпачынку фаўна” як музычная ілюстрацыя эклогі Малармэ). Імпрэсіянізм у літаратуры.

**Поль Верлен**: біяграфія паэта. Сімвалізм паэзіі Верлена. Верлен як паэт імпрэсіяніст. Паэтыка верша.

М.Багдановіч – перакладчык П.Верлена. Роля французскага паэта ў фарміраванні эстэтыкі і паэтыкі М. Багдановіча. Пераклады з Верлена А.Лойкі.

Тэорыя мастацтва бельгійскага паэта і драматурга **М. Метэрлінка** (праца “Скарбы ўтаймаваных”), эвалюцыя светапогляду і стыляў. Сімваліцкі тэатр Метэрлінка. Неарамантычная паэтыка “Сіняй птушкі”.

### Тэма 6.4. Рамантызм і неарамантызм

Неарамантызм у **англійскай** літаратуры і яго пашырэнне ў жанрах празаічнай літаратуры: прыгодніцкага рамана (Дж. Конрад, Г.Р. Хагард, апавяданні Р. Кіплінга), гістарычнага рамана (Р. Стывенсан, А. Конан Дойл, Г.К. Чэстэртан), казачнага (“Кніга джунгляў” Кіплінга) і інш. Драматургія Э. Растана (“Сірано дэ Бержэрак”, “Прынцэса Мара”). Рамантызм у **ЗША**: **Дж. Лондан** і яго прыгодніцкія творы (“Паўночныя апавяданні”). Неарамантычныя традыцыі. Тэма выпрабаванняў. Асаблівасці рамана-біяграфіі “Марцін Ідэн”. Кніга Ірвінга Стоўна “Марак у сядле” – біяграфія Дж. Лондана, “апавяданні пра тое, як ён працаваў, кахаў і змагаўся”.

## Раздзел 7. Сусветная літаратура 1-й пал. ХХ ст.

### Тэма 7.1. Літаратура 1-й пал. ХХ ст.: агульная характарыстыка

Два перыяды: 1-я палова ХХ ст. – рэвалюцыйны, мадэрнісцкі, 2-я палова – пострэвалюцыйны, постмадэрнісцкі перыяды. Кастрычніцкая рэвалюцыя і савецкі вопыт будаўніцтва сацыялізму вачыма пісьменнікаў народаў свету. Іх уплыў на пралетарскую барацьбу ў краінах. СССР як правобраз грамадства новага тыпу. Кастрычніцкая рэвалюцыя як “галоўная падзея стагоддзя”, “самы патэтычны факт”, пачатак “новай эпохі сусветнай літаратуры” – і процілеглыя меркаванні. Прычыны аднабаковасці асвятлення гістарычных падзей у Расіі і СССР, ацэнка тэарэтычных палажэнняў, адносіны да практыкі ператварэння іх у рэчаіснасць, да практыкі пабудовы сацыялізму. “Зачараванне” адных і “расчараванне” другіх, дзве плыні: адыход з Расіі і прыход інтэлігенцыі ў Расію.

Размежаванне і палярызацыя сацыяльна-культурных тэндэнцый, літаратурна-мастацкіх напрамкаў, а разам з тым разуменне агульнасці гуманістычных каштоўнасцей чалавецтва. Захаванне традыцый мінулага і адмежаванне ад іх. **Рэалізм і мадэрнізм** у літаратуры. Адлюстраванне індывідуалістычнага, суб’ектыўнага светаўспрымання, выяўленне “я” мастака. Мадэрнізм і авангардызм: спробы адыходу ад традыцый ХІХ ст. і пошукі найноўшых тэндэнцый. Авангардысцкія кірункі і плыні. Філасофскія асновы. Метад пазнання самога сябе, канструяванне рэчаіснасці. Асноўная формула (Р. Фокс “звычайны чалавек у звычайных абставінах”) і яе трансфармацыя-ўдакладненне (“самотны чалавек у варожым свеце”, “абсурдны чалавек у абсурдным свеце”). Хранатоп: сучаснае (ізаляванае ад мінулага і будучага, або змешваючае іх), мінулае (сфальсіфікаванае, сканструяванае, перакрыжаванае, па-за часам і прастораю), будучае (або яго няма, або яно няяснае, статычнае, замкнёнае і інш.). **Кубізм** як мадэрнісцкі кірунак (канструяванне на паверхні, раскладванне на простыя геаметрычныя фігуры – аналітычны кубізм, з прымяненнем калажу – сінтэтычны кубізм). Уплыў на творчасць Г. Апалінэра, складванне яго эстэтычнай праграмы (“сюр-рэалізму”, вынайдзены ім тэрмін выкарыстаны для іншага кірунку), дзеля пазнання рэчаіснасці. Знаёмства паэта з кубістамі. **Дадаізм:** узнікненне на хвалі антываеннага пратэсту і яго адмаўленне ад палітычных і сацыяльных зрухаў (пазіцыя незалежнасці), ад традыцый

папярэдняга мастацтва (сумненне ва ўсім), ад логікі (замацаванне абсурду), ад структуры мастацкага твора і вобраза (вылучэнне абсурднасці як прыёму мастацтва). Упершыню launched ператварэнне мастацтва ў антымастацтва, растварэнне мастацтва ў рэчыўным свеце, падмена мастацкага твора прадметамі рэчыўнага свету. **Футурызм**: “Футурыстычны маніфест” Ф.Т.М. Марынеці. Свет як “перамога хуткасці і энергіі”. Вобразы хуткага руху ў творах: прадметы, прырода, паветра і інш. Урбанізм. Эстэтыка індустрыі. **Экспрэсіянізм** як кірунак еўрапейскага мастацтва: адлюстраванне ў ім унутраных перажыванняў суб’екта, скажэнне вобразаў знешняга свету дзеля перадачы свету ўнутранага (вобраз крыку). **Сюррэалізм:** выток мастацтва – сфера неўсвядомленага. Маніфест А. Брэтона. Асаблівасці метаду і структура мастацкага вобраза, паэтыка. **“Плынь свядомасці**” як метад (тэрмін з 1890 г. уведзены філосафам У. Джэймсам) – метад адлюстравання непарыўнага руху думак, пачуццяў, уражанняў, яго выкарыстанне ў літаратуры. Інтравертнасць апавядання. “Плынь свядомасці” ў творчасці М. Пруста, В. Вулф, Дж. Джойса, У. Фолкнера.

## Тэма 7.2. Проза авангарду

**М. Пруст**: Старонкі з біяграфіі ў кантэксце мастацкай творчасці. Метад успамінаў. Цыкл “У пошуках страчанага часу” (7 частак, 15 кніг): жанравая асаблівасць раманаў цыклу, іх тэматыка. Раман “У кірунку да Свана” як прыклад літаратуры “плыні свядомасці”. **Дж. Джойс**: “малая радзіма”, рэлігія, палітыка ў асаблівасцях жыццёвага лёсу пісьменніка. Дублін як “цэнтр параліча” ў зборніку “Дублінцы”. Гісторыя духоўнай эвалюцыі героя ў “Партрэце мастака ў юнацтве”. Аснова мастацкай сімволікі, рэальны і міфічны планы ў рамане “Уліс”. Архітэктоніка твора і яе адпаведнасць “Адысеі” Гамера. Жанравая асаблівасць (ад міфа – раман прыгод, падарожжаў, вандраванняў героя). Архетыпы рамана. **Ф. Кафка**: жыццёвы шлях пісьменніка. “Маленькі чалавек”, яго згубленасць у свеце (“як згубленая ноччу ў гарах авечка”), абсурднасць свету і абсурднасць героя ў ім (навелы “Ператварэнне”, “У папраўчай калоніі”, раманы “Замак”, “Працэс”). Алегарызм і сімволіка вобразаў. Уплыў экспрэсіянізму на творчасць Кафкі. Элементы “магічнага рэалізму”.

## Тэма 7.3. Паэзія авангарду

**Г. Апалінэр** – французскі паэт, па паходжанню з-пад Навагрудка. З роду Кастравіцкіх (як і К. Каганец). Жыццёвы лёс, сяброўства з прадстаўнікамі авангарду. Удзел у Першай сусветнай вайне. Прыналежнасць да кубізму і футурызму (раман “Паэт убіенны”, паэтычныя творы “Алкаголі” і “Каліграмы”). Духоўная сувязь паэта са светам сялянства (апавяданне “Сустрэча ў Празе”, вершы). Пераклады з Апалінэра па-беларуску, выданне ў Беларусі яго твораў.

**Р.М. Рыльке** – паэт-міф. Пражскі перыяд: памкненне да цэласнасці. Думкі пра Расію, наведванне краіны (артыкул “Рускае мастацтва”, зборнік “Часаслоў”, канцэпцыя творчасці ў першы перыяд). Гады вандраванняў. Новая эстэтычная канцэпцыя ў “Кнізе Вобразаў”, у “Новых вершах”. Перыяд сталасці – і змяненне паэтычнага крэда. Зварот да формы элегіі (“Дуінскія элегіі”). Аднаўленне санетнай формы: “Санеты Арфею”, дзе Арфей – архетып культуры, вялікай

творчай сілы, што здольна выратаваць сусвет. Сінтэз мастацкіх метадаў у паэзіі. Беларускія пераклады.

## Тэма 7.4. Літаратура еўрапейскіх краін

**Францыя**. Фарміраванне розных кірункаў авангардызму ў французскай літаратуры пачатку XX ст.: кубізму, сюррэалізму, літаратуры "плыні свядомасці" і інш. Г. Апалінэр як лідэр авангарду ў Парыжы. Пераход шэрагу пісьменнікаў-мадэрністаў да рэалізму (П. Элюар, Л. Арагон). Рэалістычная традыцыя ў літаратуры: жанр сямейнага рамана (Ф. Марыяк "Тэрэза Дэскейру", бел.пераклад, "Клубок гадзюк", "Пустыня кахання" і інш., раманы Р.М. дзю Гара, росквіт жанру ў 2-й пал. XX ст.: раманы М. Друона, Ф. Эрыа, Э. Базэна). **А. дэ Сент-Экзюперы**: біяграфія – рамантычная, смерць – легендарная. "Урокі" Экзюперы. Пошукі вышэйшага маральнага закону, вобразы-сімвалы ў творах ("Планета людзей", "Маленькі прынц"). Творчасць Ж.Както – паэта, драматурга, кінарэжысёра.

**Англія і Ірландыя.** Першая сусветная вайна ў літаратуры (Р. Олдзінгтан). Рэалістычная традыцыя: даследаванне праблем віктарыянскай эпохі ў цыкле раманаў "Сага аб Фарсайтах" і яго працягу ("Сучасная камедыя") Д. Голсуорсі. Навукова-фантастычныя раманы Г. Уэлса "Машына часу", "Барацьба сусветаў", "Містэр Блетсуорсі на востраве Рэмпаль". Уключэнне элементаў навукова-фантастычнай літаратуры ў антыўтопію ("Прыгожы новы свет" О. Хакслі, "1984" Дж. Оруэла). Разбурэнне традыцыйнага рамана ў прозе Дж. Джойса, Д. Г. Лоўрэнса, В. Вульф, С. Моэма і інш.

**Германія.** Пачатак стагоддзя – этап у развіцці нямецкамоўнай літаратуры ў Празе (паэзія Р.М. Рыльке, проза Ф. Кафкі). Творчасць братоў Манаў: Г. Ман (сатырычнае майстэрства ў давеймарскі перыяд – раман "Настаўнік Гнюс, альбо Канец аднаго тырана", традыцыі рамана выхавання ў "Вернападданым", цыкл раманаў "Імперыя", жанр гістарычнага рамана – дылогія пра французскага караля Генрыха IV); Т. Ман ("Будэнброкі" як "схаваны пад маскай сямейнай хронікі сацыяльна-крытычны раман", навелы "Трыстан", "Смерць у Венецыі", "Тоніо Крёгер", "Марыо і штукар", раманы "Чарадзейная гара", пенталогія "Іосіф і яго браты", "Доктар Фаўстус"). Літаратура пра Першую сусветную вайну і пасляваенную рэчаіснасць (Э.М. Рэмарк). Філасофска-інтэлектуальны раман у творчасці Г.Гесэ (грамадзянства Швейцарыі): "Стэпавы воўк", "Паломніцтва ў краіну Усходу", "Гульня шкляных перлаў", "Сідхартха". Спецыфіка жанру рамана інтэлектуальнага, філасофскага, рамана-сімфоніі, рамана-навуковага трактата, рамана-біяграфіі, выхаваўчага і псіхалагічнага ў нямецкай літаратуры (Г. Гесэ, Т. Ман). Літаратура напярэдадні і ў час Другой сусветнай вайны: фашысцкая літаратура (Г. Грым, Э. Юнгер, О. Гмелін), дэмакратычная літаратура (Л. Фейхтвангер, А. Цвейг, А. Дзёблін), сацыялістычная літаратура (І. Бехер, Б. Брэхт), літаратура Супраціўлення і ў выгнанні (Т. Ман, Г. Ман, Г. Зэгерс і інш.).

**Іспанія**. "Пакаленне 1898": філосафы Мігель дэ Унамуна, Хасэ Артэга-і-Гасэт, празаік Асорын (Хасэ Марцінэс Руіс), паэт Хуан Рамон Хіменэс. Драматургія Ф. Гарсія Лоркі, яго паэзія, традыцыі народнай песні Андалусіі

(“Цыганскі рамансэра”), музыка і паэзія ў зборніку “Блакітны звон Гранады” – выбранай лірыкі Гарсія Лоркі на беларускай мове (пераклад Р. Барадуліна). Іспанія ў творчасці замежных пісьменнікаў-удзельнікаў Грамадзянскай вайны.

**Італія**. На мяжы XIX–XX стагоддзяў: паэзія Дж. Кардучы, творы Г.Д. Анунцыо (раманы пра карупцыю і скандалы: “Невінаваты”, “Трыумф смерці”, п’еса “Джаконда”, зборнікі вершаў, уплыў Ніцшэ, падтрымка ідэй фашызму), гісторыка і філосафа Б. Крочэ. С. Квазімадо як прадстаўнік “мадэрна”.

**Нарвегія**. Нобелеўскі лаўрэат К. Гамсун: аўтабіяграфічнасць рамана “Голад”. Тыпалагічнае падабенства вобразаў К.Гамсуна (раман “Вікторыя”) і М.Зарэцкага.

## Тэма 7.5. Літаратура ЗША

Працяг традыцый XIX ст. ў паэзіі К. Сэндберга, Р. Фроста. Развіццё жанру апавядання (У. Сараян). Уплыў імажынізму на ўздым эксперыментальнай паэзіі (Эзра Паўнд, Т.С. Эліят), спробы стварэння сучаснага амерыканскага эпасу (Э. Паўнд “Песні” і інш.). “Пакаленне дваццатых гадоў”: літаратура “страчанага пакалення” (Э. Хемінгуэй), крытыка рэчаіснасці (С. Льюіс, Ш. Андэрсан). “Чырвоныя трыццатыя”: выступленні супраць фашызму (С. Льюіс, Э. Сінклер), раманы Дж. Дос Пасаса. Творчасць Ф.С. Фіцджэральда (аўтабіяграфічны раман “Па гэты бок раю”, раманы “Вялікі Гэтсбі”, “Ноч пяшчоты”). Творчасць пісьменнікаў амерыканскага Поўдня: спецыфіка паўднёвага міфа і рэчаіснасць у раманах У. Фолкнера. Ёкнапатафа: вывучэнне чалавека і свету ў раманах “Сарторыс”, “Шум і лютасць”, “Вёсачка”, “Горад”, Асабняк” (параўнанне Ёкнапатафы з “Новай зямлёй” Я.Коласа). Чалавек і Час у творчасці Э.Хемінгуэя.

## Тэма 7.6. Першая сусветная вайна і літаратура

Першая сусветная вайна як вынік гістарычных, палітычных, культурных працэсаў, як пачатак усеагульнага крызісу. Раман Анры **Барбюса “Агонь**” і дакументальна-мастацкія запіскі М. Гарэцкага “На імперыялістычнай вайне”: параўнальная-тыпалагічная характарыстыка твораў. Асаблівасці жыццёвага шляху і эвалюцыя светапоглядаў аўтараў. Літаратура **“страчанага пакалення”:** прычыны яго з’яўлення. Старонкі з біяграфіі і творчасці пісьменнікаў: Э. Хемінгуэй (апавяданні “Дома”, “На Біг Рывер”, раманы “Бывай, зброя”, “І ўзыходзіць сонца (Фіеста)”), Э.М. Рэмарк (“На заходнім фронце без перамен”, “Вяртанне”), Р. Олдзінгтан (“Смерць героя”) і інш. Тэма вайны: асвятленне яе прычын і вынікаў. Эвалюцыя светапогляду – герояў і аўтараў. Аўтарскае слова ў раманах. Тэма вяртання. Герой у пасляваенным свеце. Мастацкая дэталь: яе канкрэтнасць і сімволіка. Пацыфісцкая літаратура: яе неаднароднасць. Пазіцыя Р.Ралана і яго антываенныя выступленні.

Антываенны, антыфашысцкі кірунак зборніка апавяданняў А.Барбюса “Падзеі” (1928, бел. пер. “Розныя факты”, 1929). Роля Барбюса ў гісторыі (артыкул Я. Коласа “Памяці Анры Барбюса”, 1935). Роля пісьменнікаў-рэалістаў і іх выступленняў у антываенным руху. Знаёмства з імі на Беларусі.

### Тэма 7.7. Пісьменнікі свету ў барацьбе супраць фашызму

Зараджэнне антыфашысцкай літаратуры. Т.зв. вераснёўская літаратура ў **Балгарыі**. Грамадзянская вайна ў **Іспаніі** і літаратура: забойства Ф. Гарсія Лоркі, выгнанне лепшых паэтаў, барацьба супраць фашызму ў Іспаніі як чалавечы абавязак (Э. Хемінгуэй і яго апавяданні, нарысы, сцэнарый кінастужкі "Іспанская зямля", раман "Па кім звоніць звон" і інш.). "Чорныя 30-я" ў літаратуры **Германіі**: фашысцкая прапаганда – і супраціўленне дыктатуры ў фашысцкіх засценках, літаратура ў эміграцыі. Навела Т. Мана "Марыо і штукар". Раман Г. Зегерс "Сёмы крыж". **Чэхаславакія:** п'еса "Маці" К. Чапэка, вобраз маці-радзімы. Дакументальна-мастацкая кніга "Рэпартаж з пятлёй на шыі" Ю. Фучыка.

## Раздзел 8. Сусветная літаратура 2-й пал. XX – пач. XXI стст.

### Тэма 8.1. Літаратура 2-й пал. XX ст.: агульная характарыстыка

Асаблівасці сусветнага літаратурнага працэсу XX – пач. XXI стст. Гістарычнае значэнне перамогі над фашызмам. Сацыяльна-палітычныя зрухі ў 2-й палове XX – пач. XXI стст. Мастацкае засваенне рэчаіснасці ў нацыянальных літаратурах народаў свету. Дасягненні літаратур, якія вызначаюць шляхі развіцця сусветнага літаратурнага працэсу, і т. зв. малых еўрапейскіх літаратур; уключэнне ў яго новых літаратур. Сусветны літаратурны працэс праз прызму навукі і мастацтва. Абнаўленне мастацкай палітры літаратуры. Крызіс традыцыйных каштоўнасцей у гісторыі, філасофіі, мастацтве і ў літаратуры. Пошукі новых арыенціраў і шляхоў развіцця нацыянальных (сусветнай) літаратур.

### Тэма 8.2. Літаратура пра Другую сусветную вайну

Першы з'езд нямецкіх пісьменнікаў (1947). Літаратура "пакалення тых, хто вярнуўся" (драма В. Борхерта "За дзвярыма"). Вывучэнне фашызму праз прызму сучаснасці (раманы Г. Бёля, В. Кёпена і іншых заходнегерманскіх пісьменнікаў). Г.Бёль: "Дом без гаспадара", "Більярд а палове дзесятай": цікавасць да творчасці пісьменніка ў Беларусі. Тэма барацьбы з фашызмам у літаратуры ГДР: жанр рамана выхавання ("Прыгоды Вернера Хольта" Дз. Ноля, "Мы не пыл на паветры" М.В. Шульца, "Актавая зала" і "Прыпынак у дарозе" Г. Канта). "Нямецкая споведзь" І. Бехера, тэма "звычайнага фашызму" (проза Ф. Фюмана, К. Вольф). "Пераадоленае мінулае" і "непераадоленае мінулае" ў нямецкамоўнай літаратуры.

Францыя: літаратура супраць вайны. Раман Р. Мерля "Смерць – маё рамяство". Вяртанне ў мінулае і абвінавачванне фашызму ў прозе чэха Я.Отчанашака ("Рамэо, Джульета і цемра", "Храмы Арфей"). Мастацкая і дакументальная літаратура на славянскіх землях (польскія зборнікі "Мы былі ў Асвенцыме", кніга З. Налкоўскай "Медальёны"; літаратура пра Лідзіцэ, Хатынь і іншыя "вогненныя вёскі") і інш.

## Тэма 8.3. Экзістэнцыялізм

Экзістэнцыялізм – новая філасофская, літаратурна-мастацкая сістэма. Час, нацыянальныя асаблівасці зараджэння (Л. Шэстаў, М. Бярдзяеў, М. Хайдэгер, К. Ясперс, Ж.П. Сартр, А. Камю, С. дэ Бавуар і інш.). Пытанне пра ісціну як асноўная праблема вучэння. Асноўныя паняцці: “сітуацыя”, “выбар”, “адказнасць”, “абсурднасць” і “асуджанасць”, адкрыццё ў абсурдзе новага сэнсу існавання. Філасофія Ж.П. **Сартра**, асноўныя тэзісы трактата “Быццё і нішто” ў тэксце лекцыі “Экзістэнцыялізм – гэта гуманізм”. Проза і драматургія Сартра як вырашэнне экзістэнцыяльных праблем “на практыцы”, у мастацкай творчасці (зб. апавяданняў “Мур”, п’еса “Пры зачыненых дзвярах”). П’еса “Мёртвыя без пахавання”.

З гісторыі жыццёвага і творчага шляху **А. Камю** (трыпціх з яго “Запісных кніжак”). Філасофія “абсурду”: драматургія (“Калігула”, “Непаразуменне”), проза (“Міф пра Сізіфа”, аповесць “Чужаніца”): становішча героя ў свеце – “адарванасць”, адчужанасць ад іншых, даследаванне душы героя ў двух кірунках – судом і самім героем, імкненне знайсці ісціну за межамі вызначанага, расплата. Філасофія “бунта” – новая праграма жыцця і паводзін чалавека ў рамане “Чума”, прызнанне існавання іншых каштоўнасцей акрамя традыцыйных, афіцыйных або агульнапрынятых, сімволіка “чумы” на значным адрэзку часу. Трэці перыяд у творчасці Камю: матывы і вобразы.

Літаратура экзістэнцыялізму ў беларускіх перакладах. Пастаноўка п’ёсы “Пры зачыненых дзвярах” у Маладзёжным тэатры. Элементы экзістэнцыялізму ў літаратуры Беларусі. Вершы М. Багдановіча “Ой, чаму я стаў паэтам...”, “Даўно ўжо целам я хварэю і хвор душой...” і інш. Разуменне свабоды на мяжы са смерцю (т.зв. “пагранічная сітуацыя”). Экзістэнцыяліцкія матывы ў беларускай паэзіі (А. Разанаў – зборнік “Шлях-360”) і прозе (аповесці і апавяданні В. Быкава, дылогія “Партызаны” А. Адамовіча, зборнік “Белы мурашнік” П. Васючэнкі).

## Тэма 8.4. Неаавангардызм. “Тэатр абсурду”. “Новы раман”

Паняцце пра неавангардызм. **“Тэатр абсурду”** (авангардысцкі кірунак – С. Бекет, памяркоўная абсурдысцкая драма – Э. Іонэска). Эксперыментальны кірунак – **“новы раман”:** імкненне ўбачыць свет па-новаму, выключыўшы герояў, аўтара, падзеі і інш. Н. Сарот – французская пісьменніца, руская па паходжанню, адлюстраванне “трапізмаў” (адценняў, напаўусвядомленых пачуццяў, рухаў душы) у раманах “Залатыя плады”, “Ці чуеце вы іх?”. Падрабязнасці рэчыўнага свету, дэталёвасць у апісанні прадметаў у раманах “Рэўнасць”, “У лабірынце”А. Роб-Грые, тэарэтыка “новага рамана”. Імкненне карэнным чынам змяніць традыцыйную раманную структуру ў творчасці М. Бютора (“Ступені”, “Час, які цячэ” і інш.). “Новы раман” як “антыраман”.

## Тэма 8.5. Постмадэрнізм

Постмадэрнізм як процістаянне мадэрнізму і памкненне да мастацка-стылявых пошукаў на новым фармальна-змястоўным узроўні. Неабходнасць пераадольвання як прыкмета аднаўлення мастацтва ў 2-й палове XX ст. Спалучэнне розных стыляў (класіцызм і барока, сентыменталізм і рамантызм і інш. у рэчышчы элітарнага мастацтва) пры парушэнні ўсталяваных межаў

паміж імі. Спроба вярнуць страчанае – першабытнае, першапачатковае, натуральнае, сапраўднае... – праз выйсце за межы абумоўленага, афіцыйнага, традыцыйнага. Адмова ад удзелу ў палітыцы, грамадскім жыцці, ад удзелу ў Гісторыі.Ператварэнне жыцця ў Гульню. Тварэнне на новай гістарычнай, культурнай, мастацкай прасторы, множнасць сэнсаў нованароджанага вобраза, твора. Роля іроніі, якая дадае новыя эфекты. Зварот не да рэчаіснасці, а да культуры. Правобразы постмадэрнізму ў рамане Г. Гесэ “Гульня шкляных перлаў” (вобразы Касталіі, “гульні шкляных перлаў” і інш.). Спецыяліст па семіётыцы, італьянскі пісьменнік У. Эка як стваральнік т.зв. “філасофскага трылера” – “Імя ружы” (гістарычны раман з займальным сюжэтам, з традыцыямі рамана-дэтэктыва, рамана-здарэння, філасофскага і інш.) і “Маятнік Фуко”. Найбольш вядомыя творы: “Выдуманыя гісторыі” Х.Л.Борхеса, “Гульня ў класікі” Х.Картасара, “Разенкранц і Гільдэнстэрн мёртвыя” Т. Стопарда, “Парфума” П.Зюскінда, “Гісторыя свету ў 10 з паловай частках” Дж.Барнс і інш. Постмадэрнізм у Беларусі (Бум-бам-літ, газета “Наша Ніва” і інш.).

## Тэма 8.6. Раман у літаратуры ХХ ст.

Шматстайнасць жанрава-стылявых пошукаў у жанры рамана. Раман-эпапея. Інтэлектуальны раман. Філасофскі раман. Сямейны раман. Раман выхавання. Сатырычны раман. Навукова-фантастычны раман. Жанр рамана-антыўтопіі. Іншыя традыцыйныя і новыя жанравыя формы рамана ў сусветнай літаратуры.

## Тэма 8.7. Літаратура еўрапейскіх краін

Агульная характарыстыка развіцця літаратуры еўрапейскіх краін пасля Другой сусветнай вайны.

**Францыя.** Літаратура Супраціўлення, тэма вайны і антыфашысцкай барацьбы ў Францыі (Веркор “Маўчанне мора”, Р. Мерль “Смерць – маё рамяство”, А. Лану “Маёр Ватрэн”). Праблемы моладзі, студэнцкіх хваляванняў 1968 года (раман Мерля “За шклом”), маральна-этычных праблем і “грамадства спажывання” (раманы Э. Трыяле, Ж. Перэка, Ж.Л. Кюртыса). Проза Р.Гары, М.Дзюрас. Паэзія (Ж. Прэвер). Драматургія (Ж.Ануй і інш.). Развіццё семіётыкі і структуралізму, тэарэтык і прадстаўнік Р. Барт (крытычныя працы “Нулявая ступень пісьма”, “Пра Расіна”, зборнік эсэ “Міфалогія”). Літаратура на мяжы ХХ–ХХІ стст. Раманы М.Уэльбека (“Пашырэнне прасторы барацьбы”, “Элементарныя часцінкі” як “апакаліптычны вынік сексуальнай свабоды ў канцы стагоддзя”). Беларуска-французскія літаратурныя ўзаемасувязі: з гісторыі іх развіцця ў ХХ ст.

**Англія і Ірландыя.** Кірунак “сярдзітыя маладыя людзі” ў драматургіі. Т.зв. “рабочы раман” (А. Сілітоў, С. Чаплін, С. Барстоў). Філасофскі раман экзістэнцыялісцкага кірунку: А. Мёрдак (“Пунсовае і зялёнае”, “Чорны прынц”), У. Голдзінг (“Уладар над мухамі”, “Шпіль”). Антыкаланіяльны раман у творчасці Дж. Олдрыджа (“Марскі арол”, “Дыпламаты”, “Героі пустынных даляглядаў”, “Апошні дзюйм”), Г. Грына (“Ціхі амерыканец”, “Наш чалавек у Гаване”, “Камедыянты”). Паэзія (Р.Фулер, Ф.Ларкін, Т.Хьюз і інш.).

Драматургія Г.Пінтэра, Т.Стопарда. Раманы Дж. Фаўлза (“Калекцыянер”, “Жанчына французскага лейтэнанта”, “Вежа з чорнага дрэва”, “Чарвяк” і інш.). Літаратура на мяжы XX–XXI стст. Беларуска-англійскія літаратурныя ўзаемасувязі: з гісторыі іх развіцця ў XX ст.

**Германія.** Літаратура пасляваеннай Германіі: (“пакаленне тых, хто вярнуўся”, творы Г. Бёля, В. Кёпена, Г. Граса, “групы 61” і інш.). Літаратура ФРГ: агульная характарыстыка. Літаратура ГДР: Д. Ноль, М.В. Шульц, К. Вольф, Г. Кант, Г. дэ Бройн, Э. Штрытматэр, У. Пленцдорф, І. Баброўскі і інш. Драматургія (швейцарскіх пісьменнікаў) Ф. Дзюрэнмата і М. Фрыша. Паэзія (П.Цэлан і інш.). Проза Г.Граса, яе сатырычная, сацыяльная скіраванасць. “Парфума” П. Зюскінда. Літаратура аб’яднанай Германіі. Беларуска-нямецкія літаратурныя ўзаемасувязі: з гісторыі іх развіцця ў XX ст.

## Тэма 8.8. Літаратура славянскіх краін

Кастрычніцкая рэвалюцыя і яе значэнне для развіцця літаратуры ў гэтых краінах, адлюстраванне ў ёй падзей Першай сусветнай вайны. 20–30-я гады ў балгарскай, польскай, чэшскай і інш. літаратурах (Х. Смірненскі, Гео Мілеў, Н. Вапцараў, Я. Гашак, І. Волькер, М. Маерава, У. Бранеўскі, Ю. Тувім і г.д.). Тэма Другой сусветнай вайны (пісьменнікі ў эміграцыі, зварот да гэтай тэмы пасля вайны). Літаратура 2-й паловы XX ст.: мастацкае засваенне тэм рэчаіснасці, маральная праблематыка (П. Вежынаў “Бар’ер”, І. Давыдкаў “Белы конь за вакном”). Вясковае жыццё і яго адлюстраванне (Ю. Кавалец “Пераплывеш раку”, Я. Козак “Гняздо бусла”). Росквіт рамана, размыканне яго жанравых межаў, змяненне апавядальных структур, пранікненне фальклорнай, міфалагічнай вобразнасці (І. Радзічкаў, Т. Новак, Л. Мештэрхазі). Навуковая фантастыка, спецыфіка навукова-тэхнічнай, маральна-этычнай праблематыкі (творы С. Лема, П. Вежынава). Літаратура на мяжы XX–XXI стст.

## Тэма 8.9. Літаратура краін амерыканскага кантыненту

**ЗША.** Літаратура пра Другую сусветную вайну (Н. Мейлер, І. Шоу, Дж. Джонс, Дж. Хелер). Моладзь і “грамадства спажывання” (Дж. Сэлінджэр; “бітнікі”: Дж. Керуак, А. Гінзберг; “Зіма трывогі нашай” Дж.Стэйнбека як узор рэалістычнага рамана). Раманы С.Белоў, Д.Апдайка, Н.Мейлера, Д.Болдуіна і інш. Узлёт драматургіі (Ю.О’Ніл, Л. Хелман, Т. Уайльдэр, А. Мілер, Т. Уільямс). “Пластычны тэатр” Т.Уільямса і пастаноўкі яго п’ес у Беларусі. Творчасць пісьменнікаў амерыканскага Поўдня (Р. Пэн Уорэн, Харпер Лі і інш.). Праблемы фемінізму ў творах Т.Морісон, Э.Уокер і інш. Навукова-фантастычная літаратура: амерыканская традыцыя серыялаў (А. Кларк, А. Азімаў), пісьменнікі т.зв. маладога пакалення (Урсула Ле Гуін, Дж. Рус, Дж. Вульф), т.зв. “кібернетычная школа” (У. Джыбсан, Б. Стэрлінг). Спалучэнне традыцый навуковай фантастыкі і выпрацоўка жанру рамана-антыўтопіі (Р. Брэдберы, К. Вонегут). Раманы-жахі Ст. Кінга. Літаратура на мяжы XX–XXI стст. Беларуска-амерыканскія літаратурныя ўзаемасувязі: з гісторыі іх развіцця ў XX ст.

Спецыфіка **лацінаамерыканскага** рамана ў ХХ ст. Перайманне еўрапейскіх традыцый. Зварот да нацыянальнай гісторыі і народнай творчасці. Спалучэнне рэальнага і міфалагічнага, фантастыкі і гратэску ў межах магічнага рэалізму. Вобразы гвалту і адзіноты як скразныя ў лацінаамерыканскай літаратуры. **Калумбія**: Г. Гарсія Маркес: жыццёвы і творчы шлях – “падрыхтоўчая” праца да рамана “Сто гадоў адзіноты” (гісторыя Маконда і яе сувязь з лёсам шасці пакаленняў сям’і Буэндзіа як правобраз гісторыі краіны, кантынента, чалавецтва ў закінутым свеце); раман “Восень патрыярха” і аповесць “Палкоўніку ніхто не піша”. Асаблівасці магічнага рэалізму ў творчасці. **Бразілія**: Ж. Амаду “Крама цудаў”. **Аргенціна:** Х. Картасар “Выйгрышы”, “Гульня ў класікі”, зборнікі апавяданняў (экранізацыя “Буйным планам (фотапавелічэнне)” М. Антаніоні). Х.Л. Борхес: прадстаўнік магічнага рэалізму (“Кніга пра выдуманыя істоты”), “малая проза” (“Алеф”), вяртанне да фантастыкі (“Кніга пяску”). **Мексіка:** К.Фуэнтэс – гісторыя ад ацтэкаў да сучаснасці (“Месца бязвоблачнай яснасці”). **Гватэмала**: М. Астурыяс – асуджэнне дыктатуры (“Сеньёр Прэзідэнт”, “Маісавыя людзі”). **Венесуэла**: М.А. Сільва – “І стаў той камень Хрыстом”.

## Тэма 8.10. Літаратура краін Азіі

**Індыя:** бенгальска-індыйскі пісьменнік Р. Тагор: зварот да нацыянальных традыцый (паэзія і проза ў перакладах на беларускую мову). **Японія**: Ясунары Кавабата – пачуцці тугі і адзіноцтва ў творах (“Тысячакрылы жораў”). Коба Абэ – праблема адасаблення асобы і пошукі выратавання ў свеце (раман “Жанчына ў пяску”), іншыя творы, іх сугучнасць ідэям экзістэнцыялізму. Творчасць Муракамі.

## Тэма 8.11. Іерархія ў літаратуры. Прэміі

Паняцце пра **іерархію** ў літаратурным працэсе: класіка, белетрыстыка, **масавая літаратура**. Асноўныя прыкметы, прычыны распаўсюджвання мас-культа. Жанры рамана: бытавы, або жаночы; мілітарысцкі, або салдацкі; дэтэктыў (разнавіднасці: “псіхалагічны дэтэктыў”, “раман атмасферы”; класіка жанру – творы Ж. Сіменона, А. Крысці і інш.); вестэрн (падабенства да жанраў прыгодніцкай літаратуры, раманы пра Дзікі Захад і яго засяленне); коміксы, або графічная літаратура. Слоўнік мас-культа: бэстсэлер, кіч, неакіч, кэмп, кінараман, фотараман, трылер і інш. Спецыфіка распаўсюджвання масавай літаратуры на Беларусі.

**Прэміі па літаратуры.** Паэты-лаўрэаты, якіх узнагароджвалі лаўравым вянком: Ф. Петрарка, Дж. Чосер, Э. Спенсэр, Б. Джонсан, У. Вордсварт і інш. Пулітцэраўская прэмія (ЗША). Прэмія Букера (творам мастацкай літаратуры, Велікабрытанія). Ганкураўская прэмія (Францыя).

Нобелеўская прэмія (міжнародная ўзнагарода, Нобелеўскі камітэт у Швецыі). Нобелеўскія лаўрэаты. Характарыстыка творчасці (на выбар).

## Літаратура

### Асноўная

1.Адамовіч Г.Я. З крыніц сусветнай літаратуры. – Мн., 1998 (ад Старажытнасці да XIX ст.).
2.Адамовіч Г.Я. Літаратурная класіка ў параўнальным вывучэнні. – Мн., 2008.
3.Баршчэўскі Л. Літаратура ад Старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму.– Мн.: Сэр-Віт, 2003.
4.Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён. – Мн., 2006.
5.Беларуская літаратура і свет: Выбраныя тэксты для чытання і аналізу. – Мн., 2006.
6.Лявонава Е.А. Плыні і постаці. – Мн., 1998 (другая палова XIX – XX ст.).
7.Лявонава Е.А. Агульнае і адметнае. – Мн., 2003.

### Дадатковая

1. Лапидус Н.И. Античная литература. – Мн., 1986.
2. Ковалева Т.В., Лапин И.Л., Паньков Н.А. Литература Средних веков и Возрождения. – Мн., 1988.
3. Разумовская М.В., Синило Г.В., Солодовников С.В. Литература ХУ11—ХУШ веков. – Мн., 1989.
4. Лапидус Н.И., Малюкович С.Д. Литература Х1Х века. – Мн., 1992.
5. Ковалева Т.В., Леонова Е.А., Кириллова Т.Д. История зарубежной литературы (вторая половина Х1Х – начало ХХ веков). – Мн., 1997.
6. Шабловская И.В. История зарубежной литературы ХХ века (первая половина). – Мн., 1998.
7. Зарубежная литература ХХ века (Андреев Л.Г., Карельский А.В., Павлова Н.С. и др.). – М., 1996.
8. История зарубежной литературы (М.П.Алексеев, В.М.Жирмунский, С.С.Мокульский, А.А.Смирнов). – М., 1978 ( 1987, іншыя гады выдання).
9. Зарубежная литература для детей и юношества. Ч.1—2. – М., 1989.

### Хрэстаматыі

Хрэстаматыя па літаратуры народаў свету. Ч.1. 9 кл. – Мн., 1995.
Хрэстаматыя па літаратуры народаў свету: Дапаможнік. 8 кл. – Мн., 1992.
Зарубежная литература средних веков (Сост. Б.И.Пуришев). Кн. 1—2. – М., 1974.
Хрестоматия по западноевропейской литературе. Эпоха Возрождения. (Сост. Б.И.Пуришев). – М., 1947.
Хрэстаматыя па літаратуры народаў свету: ХХ ст. – Мн., 1999.
Літаратура народаў свету: Хрэстаматыя-дапаможнік для Х кл.. Ч.1—2. – Мн., 1995 (2-е выд.2001).
Зарубежная литература ХХ в. – Мн., 1989.

### Слоўнікі і энцыклапедычныя выданні

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Т.1—5. – Мн., 1984—87.
Литературный энциклопедический словарь. – М., 1987.
Краткая литературная энциклопедия: В 9 тт. – М., 1962—78.